

ПРЫЗЫЎ ВОСЕНЬ-2021: ЯГО АСАБЛІВАСЦІ **8**

ГІСТОРЫІ НЯЎДАЛЫХ СПАДЧЫННІКАЎ **12**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. АЎТОРАК № 206 (29575)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Алена БОГДАН, першы намеснік міністра аховы здароўя:**

*«Насельніцтва пачула нас і актыўна ўключылася ў вакцынацыю. Прышчапляюцца і цяжарныя жанчыны, і мамы, якія кормяць. У нас ёсць рэгіёны, якія ўжо набліжаюцца да 35 % вакцынацыі насельніцтва. Мы сабе ставім прамежкавую планку ў 40 %, як першапачаткова рэкамендавала СААЗ, але лічым, што павінна быць вакцынавана не менш за 60 % насельніцтва. Мы ідзём да гэтага — тэмпы вакцынацыі штодня нарастаюць. Больш за тое, мы ўжо пачынаем і рэвакцынацыю, бо першымі ў нас былі вакцынаваныя медыцынскія работнікі, яшчэ ў студзені, а насельніцтва ў цэлым атрымала вакцыну ў сакавіку-красавіку. Вакцынацыя не засцерагае ад захворвання ў прынцыпе, але яна засцерагае ад цяжкага, прагнастычна неспрыяльнага ходу захворвання».*

# Малыш дачакаецца цяпла



Жыхарка вёскі Пархімовічы Кіраўскага раёна Людміла ГУЗАРЭВІЧ паўтара месяца падкормлівае бусла, які не змог паляцець у вырай, а знайшоў сабе прыстанішча за вясковай ваколіцай.

— Спачатку птушка пасвілася на меліярацыйным канале, а з надыходам халадоў пайшла да нашага паселішча, — кажа Людміла Міхайлаўна, якая працуе асемянатарам на мясцовым сельгаспрадпрыемстве. — Тройчы на дзень я прыношу ёй ежу — курыныя шыйкі, рыбу — салаку, кільку. Здаецца, буслу падабаецца гэты пажыўны рацыён.

Ніхто дакладна не ведае, якая бяда здарылася з птушкай. Вясковы ветурач, які здаля агледзеў небараку, мяркуе, што птушка не набрала вагі, да таго ж у яе траўма адной нагі. Людміла Гузарэвіч першай звярнула ўвагу на самотную птушку і ўзяла яе пад сваю «сацыяльную» апеку, дала мянушку Малыш. А яшчэ Людміла Міхайлаўна датэлефанавалася да раённага аддзела аховы прыроды, і ёй далі надзею, што Малыша возьме на ўтрыманне Магілёўскі заасад.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Дзмітрый Карзюк прызначаны намеснікам міністра ўнутраных спраў. Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт.**
- «Нафтан» і «Палімір» адгрузілі першыя балоны з кіслародам для пацыентаў Наваполацкай гарбальніцы.
- **Сярэдні заробак у Беларусі ў верасні склаў Br1442,7. У жніўні сярэдняя заработная плата работнікаў складала Br1463,2, у ліпені — Br1471,7.**
- Газіфікацыю аграгарадкоў завяршылі ў Камянецкім раёне.
- **КДК выявіў перавышэнне цэн у кожным чацвёртым правераным гандлёвым аб'екце.**

Актуальнае інтэрв'ю

**Сяргей КАВАЛЬЧУК:**

## «У СПОРЦЕ НАЙВЫШЭЙШЫХ ДАСЯГНЕННЯЎ АДНА МЭТА — БЫЦЬ НАЙЛЕПШЫМІ»

### Міністр спорту і турызму пра жыццё беларускага спорту. Шчыра і аб'ектыўна

**Апошнія два месяцы самае папулярнае журналісцкае пытанне да міністра спорту і турызму Сяргея Кавальчука датычыцца выступлення беларускай каманды на Алімпійскіх гульнях у Токіа. Адказваючы, Сяргей Міхайлавіч кажа чэсна: чакалі большага, сем медалёў для краіны — мала. «На Алімпійскіх гульнях выступалі 205 краін, разыгралі 339 камплектаў узнагарод. Калі палічыць сярэднюю колькасць, то атрымліваецца прыкладна пяць медалёў на краіну, у нас іх сем. Гэта з аднаго боку. З іншага — у нас ідзе пастаянная тэндэнцыя да памяншэння. З Лондана прывезлі дзесяць медалёў, з Рыа-дэ-Жанейра — дзевяць, цяпер — сем. Многія віды спорту маглі паказаць значна лепшы вынік. Напрыклад, веславанне на байдарках і каноэ. На чэмпіянаце свету 2019 года заваявалі 14 медалёў, занялі першае каманднае месца. На Алімпіядзе — усяго адзін сярэбраны медаль. Добрыя шанцы мела Вольга Клімава, але за паўтара месяца да Алімпіяды зламала руку. Не трэба забываць, што многія спартсмены хварэлі на каранавірус, былі парушаны трэніровачны працэс, спатрэбіўся час на аднаўленне. Магчыма, іншыя працэсы, якія адбываліся ў дзяржаве, паўплывалі на выніки спартсменаў. Многія былі псіхалагічна не падрыхтаваны да выступлення на Алімпійскіх гульнях. Прычын мноства, і ў кожным канкрэтным выпадку трэба разбірацца», — адзначае міністр.**

**Алімпійскія гульні — традыцыйна экзамен для ўсёй спартыўнай галіны. Яны падкрэсліваюць перавагі, вылучаюць недахопы і задаюць вектар развіцця. Што гэты экзамен паказаў сёлета (улічваючы не толькі медалі), як будзе зроблена работа над памылкамі і чаго чакаць на наступным экзамене, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук расказаў «Звяздзе».**

СТАР. 4

Без тэрміну даўнасці

## «БЕЛАЯ ПЛЯМА» НАШАЙ ПАМЯЦІ

### Каля Мінска выяўлена буйное пахаванне часоў Вялікай Айчыннай вайны

**Нягледзячы на тое, што пошукавы сезон у 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны заканчваецца, у вайскоўцаў падраздзялення яшчэ шмат працы. На днях на 9-м кіламетры ад Мінска, у лясным масіве каля былога ўрочышча Уручча, устаноўлена буйное пахаванне перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Па папярэдніх разліках, у некалькіх брацкіх магілах спачывае звыш 38 тысяч чалавек — ваеннапалонных чырвонаармейцаў, падпольшчыкаў, партызан, мірных жыхароў...**



Фота БелТА.

Дакладную колькасць загінулых падлічаць спецыялісты. Магчыма, атрымаецца ўстанавіць і некаторыя імёны. У найбліжэйшы час дзеянням акупантаў будзе дадзена прававая ацэнка — Генеральная пракуратура яшчэ вясной узбудзіла крымінальную справу аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд.

СТАР. 9

ISSN 1990 — 763X

21206

На кантролі

# АКАЗАННЕ ПЛАНАВАЙ ДАПАМОГІ Ў КРАІНЕ НЕ СПЫНЯЕЦЦА

## Сітуацыю з каранавірусам улады трымаюць на жорсткім кантролі

**Аб гэтым заявіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА на селектарнай нарадзе па пытаннях процідзеяння распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі, якую яна правяла ў суботу з усімі галоўнымі ўрачамі медыцынскіх устаноў сталіцы.**

— У цэлым, такія нарады праходзяць штотыднёва, каб мы маглі валодаць сітуацыяй, якая адбываецца з захваральнасцю, — нагадала яна. — Вядома, дадзенае пытанне трымаем на самым жорсткім кантролі, таму што для нас гэта вельмі важна.

Спікер верхняй палаты парламента як упаўнаважаны Прэзідэнта па горадзе Мінску адзначыла, што на дадзены момант у сталіцы занята каля 50 працэнтаў ложка-месцаў у стацыянарах.

— Мы сочым за тым, каб нашы людзі маглі атрымліваць кваліфікаваную дапамогу ў стацыянарных установах. Маніторым наяўнасць лекавых сродкаў, кіслароду — усяго, што неабходна для лячэння ковід-інфекцыі. Але акрамя таго, вядома, разглядаем пытанні аказання планавай медыцынскай дапамогі — гэта таксама вельмі важна, бо людзі хварэюць на іншыя захворванні, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава нагадала прысутным, што па згаданай тэме неаднаразова выказваўся кіраўнік дзяржавы, які вельмі жорстка патрабуе, каб людзі з любымі захворваннямі атрымлівалі неабходную кваліфікаваную дапамогу і мелі магчымасць атрымліваць яе як амбулаторна, так і ў стацыянарах краіны.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што на нарадзе яшчэ раз заслухае даклады галоўных урачоў аб аказанні планавай медыцынскай дапамогі насельніцтву.

— Сітуацыя, якая складваецца ў нашай краіне, — рэгуляваная і кіраваная, — перакананая Наталля Качанава. — Яна знаходзіцца пад жорсткім кантролем не толькі кіраўнікоў сістэмы аховы здароўя, але і ўсіх кіраўнікоў дзяржорганаў. Мы разумеем, наколькі гэта важна для жыхароў краіны.

Між іншым, спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу і на аказанне планавай медыцынскай дапамогі: яна ніколі не спынялася.

— У Мінску ёсць шэраг бальніц, якія сёння працуюць гэтак жа, як і раней, — звярнула яна ўвагу і прывяла прыклады:

— У 9-й бальніцы аказвалася дапамога профільным пацыентам заўсёды. У 10-й бальніцы ў нас ёсць афтальмалагічнае аддзяленне, якое сёння функцыянуе. Мы дакладна адсочваем: хто на сябе возьме пацыентаў, якія павінны атрымліваць [планавую] дапамогу. У траўмалогіі, гінекалогіі і гэтак далей. Яшчэ раз адказна заяўляю, што гэтая дапамога не спынялася. Адзінае, калі даваліся перапрафіляваць нейкія аддзяленні пад барацьбу з ковідам, было выразна вызначана, хто возьме на сябе планавую дапамогу, — рэзюмавала яна.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Блізкая ўлада

### Спікер — на сувязі

У сераду, 27 кастрычніка, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Іванаўна Качанава правядзе прамую тэлефонную лінію.

Званкі будуць прымацца з 10.00 да 13.00 па тэлефоне 8 (017) 328-53-24.

❍ У тэму

# НЕСПЫНЕННЕ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАЙ МЕДДАПАМОГІ — АДМЕТНАЯ РЫСА БЕЛАРУСКАЙ МАДЭЛІ

**Аб гэтым заявіў міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ, які таксама расказаў журналістам пра тэндэнцыі, што датычацца захворвання COVID-19, і бесперапынныя пастаўкі лекаў.**

— Што датычыцца захваральнасці, ёсць моманты, якія выклікаюць у нас асцярожны аптымізм. Самі па сабе тэмпы прыросту захваральнасці трохі памяншаюцца. У апошні тыдзень мы бачым вельмі нязначную, але тэндэнцыю па зніжэнні тэмпаў шпіталізацыі пацыентаў у стацыянары, — прыводзіць словы міністра БелТА. — Адзін з важных кампанентаў — на некалькі чалавек у суткі зніжаецца колькасць пацыентаў, якія знаходзяцца на ШВЛ.

Між іншым, міністр звярнуў увагу на тое, што лічбы пацыентаў, у якіх дыягнастуюць ковід, пакуль што застаюцца высокімі, і адзначыў, што цяперашняя сітуацыя патрабуе ад медыкаў адпаведных намаганняў, у прыватнасці, актывізацыі работы па вакцынацыі насельніцтва.

Па яго словах, першым кампанентам вакцыны ўжо прышчапілася больш за 27 % насельніцтва:

— Мы прапануем прышчапляцца тым, хто гэтага не зрабіў. Таксама, як вы ведаеце, удакладнены паказанні і тэрміны рэвакцынацыі — прапануем прайсці і гэтую працэдуру, — кажа Дзмітрый Піневіч.

У якасці пераканаўчага прыкладу і дзеля вырашэння спрэчак вакол гэтай прафілактычнай меры міністр адзначыў, што спрачацца аб вакцынацыі можна колькі заўгодна, але з рэаніматолагамі, якія кожны дзень лечаць найцяжэйшых пацыентаў, спрачацца вельмі складана, а з паталагаанатамамі — безвынікова.

Акрамя таго, Дзмітрый Піневіч не абмінуў тэму аказання планавай медыцынскай дапамогі пацыентам.

Дзмітрый Піневіч падкрэсліў, што адной з візітных картак беларускай сістэмы аховы здароўя з'яўляецца высокая даступнасць аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву — і датычыцца гэта любога ўзроўню: ад РНПЦ да рэгіёнаў.

— У ходзе эпідэміі аказанне спецыялізаванай меддапамогі або, скажам так, неспыненне яе — адметная рыса нашай мадэлі, — падкрэсліў ён.

Паводле слоў міністра, па ўсёй краіне перапрафілявана больш за 40 % ложкавага фонду, але ўсе рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры ў поўным аб'ёме працягваюць аказваць планавую дапамогу людзям. Абласныя бальніцы таксама аказваюць планавую дапамогу, пры гэтым яны часткова перапрафіляваныя для пацыентаў з COVID-19 і са спадарожнай паталогіяй.

— Мы цудоўна разумеем, што эпідэмія сама па сабе ўплывае на даступнасць: нават СААЗ называе наступныя гады часам «нявыяўленых назалогій». Таксама выдатна разумеем — можа быць, больш, чым хто-небудзь, што жывём у ваенны час. Пандэмія — гэта вайна. Таму даручэнне кіраўніка дзяржавы ўспрымаем як даручэнне, якое падлягае безумоўнаму выкананню, як у ваенны час, — падкрэсліў Дзмітрый Піневіч.

Трэба сказаць, што медыкі, паводле слоў міністра, працуюць герaічна, у вельмі няпростых умовах. Ён адзначыў, што ўзмацненне патрабаванняў да аказання планавай меддапамогі — складаная задача для сістэмы аховы здароўя, але міністэрства адкарэкціравала планы, пачынаючы з самага маленькага цэнтра і заканчваючы буйнымі.

— Планавая дапамога адноўленая ў поўным аб'ёме — у тым, у якім гэта неабходна і ў якім яна не будзе з'яўляцца эпідэмічнай пагрозай для саміх пацыентаў, — падкрэсліў міністр.

Таксама ён расказаў журналістам аб лекавым забеспячэнні ў краіне:

— Мы ліквідавалі лагістычныя складанасці пастаўкі імпартных лекавых прэпаратаў. Фінансавыя рэсурсы на гэта вылучаны і размеркаваны, кантракты падпісаныя. Учора да нас прыбыла дадатковая пастаўка рэмдэсівіру (запасы яго мы будзем папаўняць пастаянна), таксама прыйшлі і іншыя важныя для лячэння ковідных пнеўманій прэпараты, — падкрэсліў ён і выказаў спадзяванне, што ніякіх вонкавых форс-мажорных абставін не з'явіцца. — Калі памятаеце, у першую хвалю былі праблемы са сродкамі індывідуальнай аховы. А сёння іх няма, таму што мы вырашылі пытанні імпартазамяшчэння. Мы самі робім маскі, касцюмы і тэсты. У лекавай палітыцы рухаемся па гэтым жа шляху.

Акрамя таго, на кантролі Міністэрства аховы здароўя застаецца і пытанне забеспячэння кіслародам, спажыванне якога ў цяперашнюю хвалю ўзрасло ў некалькі разоў. Міністр растлумачыў: асноўнаму прадпрыемству, якое выпрацоўвае кісларод для медыцынскіх мэт, — «Крыёну» — дапамагаюць іншыя прадпрыемствы, і выказаў спадзяванне, што з пытаннем забеспячэння кіслароду сумеснымі намаганнямі справяцца.

У канцы гутаркі Дзмітрый Піневіч нагадаў усім, што трэба берагчы адно аднаго і выконваць неабходныя рэкамендацыі медыкаў — гэты комплекс мер зніжае нагрузку на сістэму аховы здароўя і выклікае ў людзей пачуццё бяспекі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Добрая навіна

# Для паспяховага лячэння

## У Лунінцы пасля рэканструкцыі адкрылі новы корпус інфекцыйнай бальніцы

**Пытанне ўзвядзення новай інфекцыйнай бальніцы ў Лунінцы наспела даўно. Да гэтага часу інфекцыйнае аддзяленне знаходзілася ў будынку 1962 года пабудовы. Намаганнямі мясцовай улады і Міністэрства аховы здароўя праект уключылі ў пералік аб'ектаў будаўніцтва, якое фінансуецца за кошт субвенцый, што перадаюцца з рэспубліканскага бюджэту на пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.**

Будаўніцтва было распачата ў канцы вясны гэтага года. За кароткі час асвоена 5 мільёнаў 760 тысяч рублёў. І вось аддзяленне на 25 ложкаў цалкам гатовае да прыёму пацыентаў. Яно аснашчана 57 кіслароднымі пунктамі, таму пры неабходнасці там можна размясціць да 70 пацыентаў. Абсталяваны дзве палаты інтэнсіўнай тэрапіі з апаратамі штучнай вентыляцыі лёгкіх. У палатах ёсць усё неабходнае для камфортнага знаходжання хворых.

Увод у строй новага аддзялення дазволіць разгрузіць цэнтральную раённую бальніцу. Лунінец — адзін з самых аддаленых райцэнтраў Брэсцкай вобласці, там вельмі важна наладзіць якасную профільную медыцынскую дапамогу на месцы. На гэта ўказаў **намеснік прэм'ер-міністра краіны Ігар ПЕТРЫШЭНКА**, які прысутнічаў на ўрачыстым адкрыцці аддзялення:

— Лунінец — наглядны прыклад. У многіх раёнах рэалізоўваем комплексныя праекты ў плане пераснашчэння і рэканструкцыі медыцынскіх устаноў, — адзначыў віцэ-прэм'ер і пахваліў будаўнікоў, якія ўсё зрабілі ў сціслыя тэрміны і з высокай якасцю.

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА**, у сваю чаргу, заўважыў, што ў вобласці працягваецца работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў аховы здароўя:

— Сёлета здадзім корпус абласной дзіцячай бальніцы, увядзём у строй медыцынскі комплекс у Брэсце. Закладваем праграму будаўніцтва для павелічэння фонду ложкаў для кардыялагічных хворых пры абласной бальніцы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Шаўкат Мірзіёеў перамог на выбарах прэзідэнта Узбекістана

Дзеючы прэзідэнт Узбекістана Шаўкат Мірзіёеў набраў 80,1 працэнта галасоў і перамог на выбарах, заявіў кіраўнік ЦВК Зайнідзін Нізамхаджаеў на прэс-канферэнцыі. На другім месцы з 6,6 працэнта — намеснік старшыні Народна-дэмакратычнай партыі Узбекістана Максуда Варысава, на трэцім — старшыня Нацыянальна-дэмакратычнай партыі «Мілій цыкланіш» («Нацыянальнае адраджэнне») Алішэр Кадыраў з 5,5 %. Чацвёртым стаў лідар Экалагічнай партыі Нарзуло Абламурадаў з 4,1 % і апошняе месца ў старшыні Сацыял-дэмакратычнай партыі «Адалат» («Справядлівасць») Бахрома Абдухалімава з 3,4 %.

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Узбекістана Шаўката Мірзіёева з перавыбраннем на найвышэйшую дзяржаўную пасаду. «Пераканаўчая перамога наглядна дэманструе ваш высокі аўтарытэт, уяўляе сабой красамоўнае і бясспрэчнае сведчанне вялікага даверу выбаршчыкаў. Народ цалкам пацвердзіў прыхільнасць узятаму курсу на пабудову моцнай, незалежнай, сучаснай дзяржавы», — адзначаецца ў віншаванні.*

### У Судане ўведзены надзвычайны рэжым

Пра гэта абвясціў старшыня кіруючага ў краіне Суверэннага савета генерал арміі Абдэль Фатах аль-Бурхан. Ён таксама паведаміў аб роспуску як гэтай структуры, так і ўрада. Аль-Бурхан выступіў са зваротам да нацыі праз некалькі гадзін пасля арышту кіраўніка ўрада Абдалы Хамдука і шэрагу высокапастаўленых чыноўнікаў, а таксама лідараў палітычных партый. Генерал абвясціў аб прыпыненні дзеяння шэрагу артыкулаў канстытуцыйнай дэкларацыі, якая была падпісана ў 2019 годзе прадстаўнікамі ваенных і грамадзянскіх сіл, каб стаць заканадаўчай базай на пераходны трохгадовы перыяд. Акрамя таго, аль-Бурхан паабяцаў суданцам правесці парламенцкія выбары і стварыць новы незалежны ўрад. Ён назваў тое, што адбылося ў краіне, «адказам арміі на маладзёжную рэвалюцыю». У Хартуме адключаны інтэрнэт і мабільная сувязь. Стацыянарныя тэлефоны, па паведамленні тэлеканала Al Arabiya, таксама не працуюць. Армія перакрыла ўезды ў сталіцу, масты і цэнтральныя вуліцы, аўтамабільны рух у горадзе цалкам спынены. Вайскоўцы ўзялі пад кантроль будынак дзяржаўнага радыё і тэлебачання Судана. Аэрапорт Хартума таксама заблакіраваны. Палёты, паводле інфармацыі Al Arabiya, спыніліся яшчэ два дні таму. Па меншай меры 12 чалавек атрымалі агнястрэльныя раненні ў сутыкненнях пратэстоўцаў з сіламі бяспекі ў Хартуме.

**Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванні Аляксандру Сяргеевічу Гіраеву, начальніку аддзела біялагічнай разнастайнасці ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, у сувязі са смерцю МАЦІ.**

Кантэкст

# ПЕРАВАГІ ЎВОСЕНЬ ЛІЧАЦЬ

**Заўжды актуальная тэма энергетычнай бяспекі цяпер яшчэ больш абвастрылася. Прычына вельмі простая — халады. І тут словамі і лозунгамі ўжо не абысціся, паколькі яны банальна не сагрэюць. Між тым энергетычны крызіс у Еўропе працягвае набіраць абароты. Паводле меркавання экспертаў, Стары Свет чакае суровая зіма і жорсткае змаганне за рэсурсы, піша Baltnews. Адпаведна, краіны забудуць пра дэкларавaную салідарнасць членаў супольнасці.**

Напярэдадні пасол Германіі ў Расіі Геза Андрэас фон Гайр заявіў, што праблема росту цэн на газ носіць агульнаеўрапейскі маштаб. «Над гэтым усе працуюць сумеснымі намаганнямі», — адзначыў дыпламат. Аднак сітуацыя можа аказацца яшчэ горшай. Як пішуць аналітыкі амерыканскага выдання Bloomberg, Еўропу ўжо ў найбліжэйшыя месяцы чакае сур'ёзная барацьба за блакітнае паліва на фоне росту яго кошту. Як адзначаюць эксперты, ад еўрапейскай салідарнасці можа практычна нічога не застацца з прычыны будучай барацьбы за рэсурсы.

Па даных агенцтва, сховішчы газу еўрапейскіх краін запоўнены на 20 працэнтаў менш за норму. Зараз гэты паказчык складае 71 %. Пры гэтым аналітыкі перакананы, што з надыходам маразоў улады еўрапейскіх дзяржаў забароняць экспарт газу. Напрыклад, так можа паступіць Сербія, зыходзячы з заяў прэзідэнта краіны Аляксандра Вучыча. Гэтае пытанне таксама абмяркоўваецца і ў Нарвегіі, якая экспартуе энергарэсурсы. Аднак самая складаная сітуацыя, паводле Bloomberg, чакаецца ў Германіі, якая на 90 працэнтаў залежыць ад імпарту газу.

У Расіі ў сваю чаргу распавялі, ад чаго будзе залежаць экспарт газу ў Еўропу ў будучым 2022 годзе. Як паведаміла намеснік старшыні праўлення «Газпрама», гендырэктар «Газпрам экспарту» Алена Бурмістрава, аб'ём экспарту будзе залежаць, галоўным чынам, ад умоў надвор'я і кан'юнктуры рынку звадкаванага прыроднага газу (ЗПГ). Аднак у кампаніі ўстрымліваюцца ад канкрэтных прагнозаў па сёлетніх продажах блакітнага паліва на сваёй электроннай платформе.

Нядзіўна, што ўсё часцей можна пачуць меркаванні аб добрай альтэрнатыве, якая не залежыць ад кліматычных «ралі». У прыватнасці, спецыялісты французскага аператара перадачы электраэнергіі (RTE) лічаць эканамічна мэтазгодным будаўніцтва новых АЭС пры стратэгіі дасягнення вугляроднай нейтральнасці. Пра гэта гаворыцца ў апублікаванай справаздачы «Будучыня электраэнергіі — 2050», дзе разглядаюцца розныя сцэнарыі дасягнення вугляроднай нейтральнасці, паведаміла ТАСС. «Будаўніцтва новых ядзерных рэактараў актуальнае з эканамічнага пункту гледжання», — адзначаюць аўтары даклада. У той жа час яны падкрэсліваюць, што дасягненне вугляроднай нейтральнасці ў 2050 годзе немагчыма без значнага развіцця аднаўляльных крыніц энергіі. Аднак, як адзначаюць аўтары даклада, сцэнарыі, якія ўключаюць выкарыстанне новых АЭС, выглядаюць больш канкурэнтаздольнымі, нават нягледзячы на тое, што збудаванне буйных ветраных электрастанцый можа быць таннейшым. Гэта, па іх словах, звязана з неабходнасцю інвестыцый пры выкарыстанні такіх электрастанцый, у тым ліку для вырашэння праблемы захоўвання энергіі.

Раней кіраўнік Мінфіна Францыі Бруна Ле Мэр адзначаў, што калі ЕС хоча забяспечыць вытворчасць большага аб'ёму электрычнасці без дадатковых выкідаў вуглякіслага газу, то атамная энергетыка з'яўляецца моцным адказам на гэтую сітуацыю. На яго думку, краіны ЕС павінны прызнаць гэты кірунак зялёным з прычыны адсутнасці выкідаў парніковых газаў. Гэта дазволіць укладваць сродкі з праграм ЕС у будаўніцтва новых і мадэрнізацыю старых АЭС у еўрапейскіх дзяржавах.

Раней у межах паездкі ў Астравецкі раён пасля наведвання БелАЭС у гутарцы з журналістамі **Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** адзначыў, што на фоне энергетычнага крызісу, які разгортваецца ў Еўропе, росту цэн на энерганосьбіты мы зноў пераконваемся ў мудрасці прынятага кіраўніком дзяржавы рашэння аб будаўніцтве станцыі. «Беларусь ужо ніколі не пойдзе па свеце з працягнутай рукой па крыніцы энергіі. З запускам АЭС краіна забяспечыла сябе надзейнай, эфектыўнай, экалагічнай крыніцай энергіі на дзесяцігоддзі наперад, — падкрэсліў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі. — Беларуская атамная электрастанцыя стала адным з элементаў устойлівага стварэння, які здольны надаць якасна новы імпульс развіццю краіны і забяспечыць дадатковыя гарантыі ўмацаванню дзяржаўнай незалежнасці, энергетычнай і эканамічнай самастойнасці Беларусі».

Цяпер у свеце эксплуатуецца каля 450 атамных рэактараў, працягваецца будаўніцтва яшчэ больш як 50. Ніводная з развітых краін не адмовілася ад выкарыстання атамнай энергетыкі, што тлумачыцца аднойчай таннасцю выпрацоўкі такой электраэнергіі і высокай прадукцыйнасцю атамных установак. Па выніках паездкі дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі чарговы раз пацвердзіў, што сістэма забеспячэння бяспекі БелАЭС адпавядае самым высокім міжнародным стандартам. «Бяспека Беларускай АЭС — безумоўны прыярытэт для нашай краіны», — заявіў Аляксандр Вальфовіч.

Тым часам стала вядома, што місія МАГАТЭ па эксплуатацыйнай бяспецы (Pre-OSART) пачала працаваць на пляцоўцы БелАЭС, паведаміла БелТА ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў станцыі. З мэтай ацэнкі выканання беларускім бокам раней выдадзеных МАГАТЭ рэкамендацый і прапаноў па пытаннях эксплуатацыйнай бяспекі экспертная група вывучыць адпаведныя матэрыялы, а таксама наведае тэхналагічныя аб'екты станцыі.

Работа будзе арганізавана па 11 напрамках: «Лідарства і кіраванне бяспекай», «Эксплуатацыя», «Тэхнічнае абслугоўванне», «Тэхнічная падтрымка», «Навучанне і кваліфікацыя», «Радыяцыйная абарона», «Хімія», «Абмен вопытам эксплуатацыі», «Кіраванне аварыямі», «Аварыйнае планаванне і рэагаванне», «Увод у эксплуатацыю». Кіраўнік экспертнай групы Юрый Мартыненка перад пачаткам работы місіі выказаў удзячнасць беларускаму боку за супрацоўніцтва. «Мы бачым гэта запрашэнне як індыкатар прыхільнасці вашых рэгуляючых органаў і Беларускай АЭС да дасягнення найвышэйшых узроўняў па ўсіх відах бяспекі ў сферы ядзернай энергетыкі», — заявіў ён.

**Пётр ДУНЬКО.**

Надвор'е

# Адносна цёпла і ў асноўным суха

## А да канца тыдня знікнуць замаразкі і ўдзень будзе да 12—19 цяпла

**Гэтымі днямі праз тэрыторыю нашай краіны праходзіць досыць сур'ёзны антыцыклон з цэнтрам над Украінай. І, нягледзячы на тое, што цэнтр антыцыклону будзе аддаляцца ад Беларусі, яго сіл яшчэ хопіць, каб утрымліваць у нас сухое надвор'е. Праўда, атмасферны ціск пачне падаць, з'явяцца аблокі і ўзмоцніцца вецер, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Не будзе ападкаў і ў аўторак. Максімальная тэмпература паветра — ад плюс 7 да 13 градусаў цяпла. Ужо з сярэдзіны серады надвор'е пачне патроху мяняцца. У гэты дзень па поўначы Беларусі адаб'ецца ўплыў франтальнага раздзела, які ссоўваецца з боку Балтыйскага мора. У паўднёвых раёнах надвор'е працягне фарміраваць зона павышанага атмасфернага ціску. Будзе воблачна з праясненнямі. Пераважна па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні, заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да 4 градусаў цяпла, па паўночным захадзе — да плюс 6 градусаў. Удзень будзе 8—14 градусаў вышэй за нуль.

Цёплыя атмасферныя франты з Балтыйскага мора ўсталююць свой уплыў над тэрыторыяй усёй краіны ўжо ў чацвер. Будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Вецер прагназуецца заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—9 цяпла, удзень — ад плюс 9 градусаў па паўночным усходзе да 16 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Але «мокрым» надвор'е будзе ўсяго адзін дзень.

Уся справа ў тым, што ў пятніцу рост атмасфернага ціску адцісне франтальны раздзел за межы краіны. У многіх рэгіёнах ападкаў не чакаецца, толькі ўначы па паўночным усходзе краіны магчымыя кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла, удзень — ад плюс 12 да плюс 18 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, канец тыдня чакаецца па-асенняму камфортным. У суботу і нядзелю па ўсёй краіне ўплываць на надвор'е будзе зона павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў цёплым паветры. Чакаецца пераменная воблачнасць, будзе без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны, у дзённыя гадзіны ў нядзелю — парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, удзень — ад плюс 12 да плюс 19 градусаў. Як адзначаюць спецыялісты, такі тэмпературны фон у апошнія дні кастрычніка на 4—7 градусаў перавысіць кліматычную норму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# НА ЎНІВЕРСІТЭЦКАЙ ВУЛІЦЫ — СВЯТА!

## Юбілейны тыдзень стартаваў у БДУ

**З нагоды 100-годдзя вядучай ВНУ Беларусі на ўсіх факультэтах пройдуць пашыраныя пасяджэнні Саветаў. Арганізуюцца яны ў вочна-дыстанцыйным фармаце. Удзельнікамі мерапрыемстваў стануць кіраўніцтва, загадчыкі кафедраў, ветэраны працы і супрацоўнікі падраздзяленняў. Ад імя адміністрацыі ўніверсітэта з віншаваннямі выступяць прарэктары. Яны ўручаць выкладчыкам і навукоўцам факультэтаў узнагароды БДУ, профільных міністэрстваў і ведамстваў: граматы, ганаровыя граматы, лісты падзякі ўніверсітэта і рэктара, а таксама нагрудныя знакі «100 гадоў БДУ».**



Дарэчы, апошняя ўзнагарода заснавана ўпершыню ва ўніверсітэце, яна стане формай заахвочвання выкладчыкаў, навукоўцаў, кіраўнікоў і супрацоўнікаў, якія прапрацавалі ў БДУ не менш за 25 гадоў. Таксама да ўрачыстых падзей далучацца партнёры і заказчыкі кадраў, з якімі факультэты плённа супрацоўнічаюць.

Універсітэцкі штат БДУ складаюць звыш сямі тысяч супрацоўнікаў. Акадэмічны працэс забяспечвае найлепшы прафесарска-выкладчыцкі склад краіны: больш чым 3,5 тысячы выкладчыкаў, з якіх звыш 210 дактароў навук і прафесараў, больш за адну тысячу кандыдатаў навук, адзінаццаць членаў-карэспандэнтаў і восем акадэмікаў НАН Беларусі.

Урачыстае пасяджэнне Савета БДУ пройдзе 29 кастрычніка.

100-годдзе БДУ ўнесена ў спіс памятных дат ЮНЕСКА, што надзяляе мерапрыемства міжнародным статусам, пацвярджае значны ўклад беларускага ўніверсітэта ў развіццё сусветнай адукацыі і навукі. Сёння БДУ ўваходзіць у 1 % найлепшых універсітэтаў свету паводле сусветных рэйтынгаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Супрацоўніцтва

# БУДАВАЦЬ — НЕ ГАРАВАЦЬ

## На выстаўцы Baku Build у Азербайджане быў прадстаўлены нацыянальны павільён Беларусі

**Экспазіцыя Made in Belarus была прадстаўлена на XXVI Міжнароднай спецыялізаванай будаўнічай выстаўцы Baku Build, якая прайшла на мінулым тыдні ў сталіцы Азербайджана. У мерапрыемстве ўдзельнічалі пяць кампаній з нашай краіны, якія дэманстравалі прадукцыю і паслугі для развіцця будаўнічай галіны.**

Прадпрыемствы вытворчага аб'яднання «Белэнерга» — «Белэнергарамналадка» і «Белэлектрамантажналадка» дэманстравалі тэхналогіі для забеспячэння надзейнай і эканамічнай работы аб'ектаў энергетыкі, вымяральную тэхніку, сродкі аўтаматызацыі, вакуумныя выключальнікі і іншае абсталяванне. Кампанія «Энергакамплект» прадставіла на выстаўцы кабельную прадукцыю і правады рознай спецыфікацыі.

Навукова-вытворчае таварыства «АКБ ТСП» прапанавала ўласную інавацыйную тэхналогію ўзвядзення арачных канструкцый для аб'ектаў рознага прызначэння, распрацаваную спецыялістамі кампаніі «Спецмашынабудаванне», якая ўваходзіць у склад гэтага таварыства. З выкарыстаннем дадзенай тэхналогіі кампанія ўжо пабудавала 19 прамысловых будынкаў у Азербайджане.

Выстаўка Baku Build — найбуйнейшая спецыялізаваная пляцоўка Азербайджана ў будаўнічай сферы. Удзельнікі Беларускай экспазіцыі ў Баку правялі шэраг дзелавых сустрэч. У прыватнасці, з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Азербайджанскай Рэспубліцы Андрэем Раўковым, з прадстаўнікамі кіраўніцтва азербайджанскага Фонду падтрымкі экспарту і інвестыцый, а таксама азербайджанскіх будаўнічых кампаній.

Чакаецца, што беларускія кампаніі па выніках удзелу ў выстаўцы прымуць удзел у праектаванні населеных пунктаў і рэканструкцыі транспартнай інфраструктуры на тэрыторыі Азербайджана.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «У СПОРЦЕ НАЙВЫШЭЙШЫХ АДНА МЭТА —

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

***— Сяргей Міхайлавіч, Алімпійскія гульні — гэта кульмінацыя алімпійскага цыкла, які гэтым разам працягваўся пяць гадоў. Якія ўрокі былі вынесены, якія праблемы і паспяховыя прыклады ўзніклі за гэтую пяцігодку?***

— На жаль, памылак аказалася больш, чым прыкладаў правільнай работы. Радуе, што многія віды спорту стабільна дэманструюць высокія вынікі. І, як паказвае практыка, у іх наладжана сістэма, трэніровачны працэс. У скачках на батуце два алімпійскія цыклы запар — «золата». Бронзавы медаль Аліны Гарнасько ў мастацкай гімнастыцы — гэта праца не толькі самой Аліны, а ўсяго калектыву. Высокая эфектыўнасць у барцоў. На Алімпіяду паехала восем чалавек, і трое прывезлі медалі. А ў лёгкай атлетыцы паехалі 34 чалавекі, і толькі адзін медаль. Колькі надзей было на кідальнікаў, а ніводнай узнагароды. Кіданне кап'я: Таццяна Халадовіч — выдатная спартсменка, добрыя вынікі ў сезоне паказвала. У алімпійскай чэмпіёнкі вынік 66,34 метра, а ў Тані ў кар'еры і 67 метраў было. У кіданні молата Ганна Малышчык, Настасся Маслава ў сезоне за 70 метраў кідалі. Маслава пасля алімпіяды кінула на 73 метры, на Алімпіядзе — 65 метраў. У чым прычына? Магчыма, ёсць аспекты, якія мы не ўбачылі. У нас стаіць задача на ўзроўні федэрацый, міністэрства правесці глыбокі аналіз, зразумець, як рухацца далей у кожным асобным відзе спорту з кожным асобным спартсменам.

Сёння важна, каб спартсмен уваходзіў у нацыянальную каманду на аснове сваіх вынікаў, а не проста каб у спісе была пэўная колькасць спартсменаў. Будзем пераглядаць падыходы да адпраўкі спартсмена на Алімпіяду. Калі ён у 60 найлепшых у свеце не ўваходзіць, то які сэнс везці яго на Гульні? На жаль, былі спартсмены, якія на Алімпійскія гульні паехалі ў якасці турыстаў. Да наступнай летняй Алімпіяды засталося тры гады, і часу на раскачку ў нас зусім няма. Мы яшчэ ўчора павінны былі пачаць падрыхтоўку да Алімпійскіх гульняў. Для аналізу ў нас ёсць яшчэ лістапад — снежань, а з 1 студзеня ўсе павінны стаяць у страі і разумець, што наступны экзамен будзе яшчэ цяжэйшы.

***— Можна сказаць, што за дадатковы год некаторыя спартсмены «перагарэлі», «пératрэніраваліся»?***

— З пераносам Гульняў сутыкнуліся спартсмены ўсіх краін. Маладыя спартсмены набраліся вопыту, практыкі, сталі больш устойлівыя псіхалагічна. Некаторыя спартсмены працавалі па такой праграме, што выйшлі на пік формы ў 2020 годзе. Але немагчыма доўга знаходзіцца на піку формы — пачынаюцца спады, яны і здараліся. Напрыклад, Настасся Мірончык-Іванова год таму паказвала 6,94 метра, у алімпійскі ж год найлепшы вынік 6,79 метра, а ў Токіа — 6,55 метра, то-бок 40 сантыметраў сама сабе прайграла. Іван Ціхан стаў на год старэйшы, і яму стала цяжэй. Хоць я не сказаў бы, што ў нас вельмі ўзроставая каманда на фоне іншых краін. Але і вопытных спартсменаў дастаткова. У тым жа веславанні на байдарках і каноэ. Магчыма, у 2020 годзе ў Марыны Літвінчук і Вольгі Худэнкі форма была б лепшая. Тут ужо на першы план выходзіць прафесіяналізм трэнераў. І спартсмены, і трэнеры цяпер павінны дэталёва разабрацца ў кожным аспекце, каб больш не дапускаць такіх памылак. У нас жа зноў нестандартная сітуацыя — трохгадовы алімпійскі цыкл. І трэнерскі талент — укласці чатырохгадовую праграму ў тры гады. Хто здольны, у таго і вынік будзе.

І яшчэ з назіранняў: наяўнасць добрых умоў — не заўсёды гарантыя добрага выніку. Спартсмен павінен быць крыху галодны, каб у яго было імкненне паказаць вынік. А калі ў яго ўсё добра, ёсць шыкоўная база, стабільная зарплата — то навошта напружвацца: жыццё ж і так цудоўнае. Магчыма, мы тут нейкую памылку дапускаем. Для мяне гэта была першая Алімпіяда ў якасці міністра, таму нам усім трэба разбірацца.



***— Як для вас асабіста прайшла першая Алімпіяда ў якасці міністра?***

— Глядзеў начамі кожны старт нашых спартсменаў. І там, дзе не атрымлівалася, канешне, было расчараванне. Хачу сказаць, што самому ўдзельнічаць у спаборніцтвах на сто працэнтаў прасцей. Сабе заўсёды прасцей прад'явіць прэтэнзіі і знайсці апраўданне. А назіраць і глядзець збоку вельмі цяжка, выгараеш эмацыянальна.

> **«Многія нашы спартсмены выехалі за мяжу, паехалі па доўгі рубель. Гэта яшчэ і паказчык патрыятызму: тут у іх укладалі, імі займаліся, а як толькі нечага дасягнулі, адразу з'ехалі. Але гэта іх выбар. Так, для дзяржавы гэта страта. Былі б тут выдатныя спецыялісты, магчыма, было б лепей».**

***— Сяргей Міхайлавіч, на Параалімпійскіх гульнях 2016 года параалімпійцы заваявалі 19 медалёў. Сёлета 7 медалёў і з іх пяць залатых. Чым можна растлумачыць, што людзі з абмежаванымі магчымасцямі выступаюць лепш, чым фізічна здаровыя?***

— Медальныя вынікі ў інваспорце вельмі цяжка ацаніць. Але, мабыць, варта ўдзяліць гэтым відам спорту больш увагі. У Токіа ездзіла маленькая каманда. І калі б не было Ігара Бокія, было б усяго два медалі. Таму нельга сказаць, што параалімпійцы выступілі лепей, чым алімпійцы. Як я ўжо казаў, цяпер час вялікага аналізу і перазагрузкі, у тым ліку і для параалімпійцаў.

***— Вы згодныя з тым, што параалімпійскі спорт знаходзіцца ў цені алімпійскага?***

— Гэта вельмі спецыфічны спорт. Адрозніваецца сістэма падрыхтоўкі, патрэбны пэўныя ўмовы. Трэба ўлічваць, што ў кожнага спартсмена розныя асаблівасці здароўя. Давайце ўспомнім прыклад Аляксея Талая. На параалімпіядзе ён спаборнічаў з людзьмі, у якіх ёсць канечнасці, фізічная перавага. Хіба правільна, што ён адразу апынуўся ў пройгрышным становішчы? Міжнародным федэрацыям таксама трэба да гэтага ўважліва ставіцца пры арганізацыі спаборніцтваў. Зразумела, для краіны вельмі важныя і колькасць медалёў, і дасягненні. Але ў інваспорце галоўнае не колькасць медалёў, а колькі людзей ім займаюцца, адчуваюць сябе такімі ж, як і ўсе людзі. Інваспорт павінен пераследваць іншыя мэты, а не думаць аб перамогах любой цаной. Не трэба параўноўваць спаборніцтвы ў вялікім спорце і ў параалімпійскім, гэта мая пазіцыя.

***— Але ж развіваць яго трэба?***

— Канешне, трэба. Але варта разумець, што ў нас невялікая дзяржава, а відаў спорту толькі 47 у міністэрстве прафілююцца. І на кожны від спорту патрэбны сродкі, адміністрацыйны апарат. Сёння ж прынята, каб у камандзе быў псіхолаг, два масажысты, адміністратар і гэтак далей. На турнір едзе адзін спартсмен, а з ім 10чалавек, якія на яго працуюць. А хто будзе зарабляць на гэтых спартсменаў? Гэта філасофскае і рытарычнае пытанне. І датычыцца яно ўсяго спорту, а не толькі параалімпійскага.

***— На яго можна знайсці адказ?***

— Трэба выбраць тыя віды спорту, якія не трэба культываваць і развіваць на прафесійным узроўні, і тыя, якія ў першую чаргу фізкультура, бо вынікаў яны не прыносяць. А ім жа і фармакалогія, і масажысты, і псіхолагі патрэбныя. Яны так кажуць: «Вы нам усё дайце, а мы, магчыма, калі-небудзь станем пераможцамі». Ключавыя словы тут «магчыма» і «калі-небудзь». Ніхто не дае гарантыі, што падрыхтуе спартсмена, які будзе ўсюды перамагаць. Мы нікому не забараняем развівацца, калі ласка, працуйце, знаходзьце спонсараў, аднадумцаў, выходзьце на пэўны ўзровень. І калі будуць перспектывы — дзяржава дапаможа. А пакуль пэўнага ўзроўню няма — гэта фізкультура, а не спорт.

Нам сёння нельга распыляць сродкі на ўсе віды спорту. Для кожнага свой спорт будзе самы важны, гэта зразумела. Але мы не можам забіраць грошы ў людзей і аддаваць іх на хобі спартсменаў ці трэнераў. Вядома, прасцей быць трэнерам ва ўмоўным бадмінтоне, чым працаваць на заводзе ці араць поле. Таму сёння ўсе хочуць быць у спорце.

***— У такім выпадку дзе заканчваецца фізкультура і пачынаецца спорт?***

— Там, дзе пачынаюцца медалі чэмпіянатаў Еўропы, свету. Гэтыя спартсмены ўжо могуць разлічваць на дзяржаўную падтрымку. Ёсць віды спорту, якія традыцыйна прывозяць медалі, мы іх бачым і падтрымліваем.

***— Сяргей Міхайлавіч, як паказвае практыка, маладыя спартсмены на міжнародных турнірах паказваюць высокія, годныя вынікі. Чаму яны губляюцца на дарослым узроўні? Што з гэтым рабіць?***

— Тут можа быць мноства прычын. На юніёрскім узроўні не такі жорсткі антыдопінгавы кантроль, як на дарослым. А потым аказваецца, што спартсмен ужываў забароненыя прэпараты. У нас і ў лёгкай атлетыцы, і ў цяжкай былі падобныя праблемы. У свеце такая праблема існуе. Далей. Са спартсмена ў юніёрскім узросце могуць выціснуць усе сокі, фарсіраваць падрыхтоўку. І да дарослага ўзросту ён даходзіць выціснутым, няздольным паказваць вынікі. Сёння сустракаюцца прыклады, калі трэнеры дзеля кваліфікацыі, зарплаты выціскаюць са спартсмена ўсё, што можна.

Здараецца, што чалавек заканчвае вучылішча алімпійскага рэзерву, а ў нацыянальную каманду не трапляе. І ён сыходзіць са спорту, хоць мае шанцы праз некалькі гадоў паказаць добрыя вынікі. У некаторых відах вынікі прыходзяць з узростам. У тых жа кіданнях у 19 гадоў ніхто не становіцца чэмпіёнам свету — раскрываюцца ў 25—30 гадоў. А ён у 18 гадоў заканчвае вучылішча і не трапляе ў каманду, бо там моцныя дарослыя спартсмены. Але ж у яго ўкладзены сродкі, і праз некалькі гадоў ён можа стаць чэмпіёнам. Мы гэтае пытанне цяпер узнялі. У рэгіёнах, у цэнтрах алімпійскага рэзерву будзем ствараць зборныя каманды абласцей, каб весці спартсмена да пэўнага ўзросту, каб ён атрымліваў хоць якія грошы, трэніраваўся. Калі глыбока вывучаць спорт вышэйшых дасягненняў, то можна знайсці сістэмныя памылкі, якія трэба выправіць.

***— Спецыфіка некаторых відаў, напрыклад, мастацкай гімнастыкі, прадугледжвае заканчэнне кар'еры ў маладым узросце. Але ж вопыт гэтых спартсменаў можна выкарыстоўваць для развіцця спорту.***

— Яго выкарыстоўваюць, вядома, калі сам спартсмен гэтага хоча. Напрыклад, нашы гімнасткі ўжо з другога курса вучобы ва ўніверсітэце фізічнай культуры працуюць як памочнікі трэнераў.

***— А ў той жа час у многіх відах спорту скардзяцца, што не хапае дзіцячых маладых трэнераў, асабліва ў рэгіёнах...***

— Гэта складанае пытанне, да яго трэба ставіцца комплексна. Мае значэнне і наяўнасць у рэгіёнах базы адпаведнага ўзроўню, і кваліфікацыя трэнерскіх кадраў. Дзіцячы трэнер працуе з малым, рыхтуе яго да пэўнага ўзроўню. А што далей, калі ў вобласці няма аддзялення па гэтым відзе спорту? Акрамя таго, усе хочуць зарабляць. У нас моладзь хоча адразу і шмат, а ў жыцці вельмі складана гэта атрымаць. Хоць сёння маладыя трэнеры, якія заканчваюць БДУФК, першыя два гады, пакуль у іх няма вынікаў, зарабляюць так, як трэнер з пяцігадовым стажам. Матэматыкаваныя людзі, якія хочуць працаваць і бачаць спорт справай свайго жыцця, працуюць і зарабляюць. Выпадковыя ў гэтым відзе дзейнасці сябе не знаходзяць.

***— Сёння ў краіне працуе шмат прыватных школ і секцый па розных відах спорту. Наколькі яны дапамагаюць у падрыхтоўцы спартыўнага рэзерву?***

— Пасля гэтых секцый дзеці могуць пераходзіць у дзіцяча-юнацкія школы, вучылішчы алімпійскага рэзерву, калі вытрымліваюць адбор. Пытанне ў тым, што мы не заўсёды ведаем, якія спецыялісты працуюць у прыватных школах. Бацькі з радасцю аддаюць дзяцей, яны гады тры займаюцца, а ў дзіцяча-юнацкую школу не праходзяць адбор. І там у трэнераў няма часу, каб з нуля вучыць дзіця пасля прыватнай школы. Гэта трэба ўлічваць.

***— Сёння актуальнае пытанне легіянераў: цэлая плеяда фігурыстаў, Мацвей Волкаў у лёгкай атлетыцы і яшчэ мноства спартсменаў у розных відах. Сяргей Міхайлавіч, хіба гэта не шлях меншага супраціўлення: запрасіць ужо гатовага спартсмена, які будзе зарабляць медалі, куды прасцей, чым выхаваць свайго?***

— Не, гэта не шлях найменшага супраціўлення. Гэта, наадварот, магчымасць з дапамогай легіянераў падцягнуць нашых спартсменаў. Нейкім чынам легіянер выйшаў на высокі ўзровень, а чаму наш спартсмен не можа? Мы працуем 20 гадоў і не змаглі нікога падрыхтаваць, значыць, у нас няма спарт-

# ДАСЯГНЕННЯЎ БЫЦЬ НАЙЛЕПШЫМІ»

сменаў і трэнераў высокага ўзроўню. Значыць, прыйшоў час запрасіць спецыяліста, паглядзець, як трэба працаваць, павучыцца. У фігурным катанні да нас прыехаў Алег Васільеў. Ён у якасці спартсмена прайшоў шлях ад дзіцячага спорту да алімпійскага чэмпіёна і ўсё тое ж самае прайшоў як трэнер. У яго вялізны вопыт. Так, для нас ён легіянер. Але ў нашым фігурным катанні ці ёсць трэнер такога ўзроўню? Няма.

***— Але ж Алег Васільеў — трэнер. А што наконт запрошаных спартсменаў?***

— Мы можам сёння набраць маленькіх дзяцей і 10—15 гадоў весці іх да пэўнага ўзроўню. Аднак мы не можам чакаць 10—15 гадоў. Нам сёння трэба і дзяцей рыхтаваць, і вынік паказваць. Мы ж не запрашаем легіянераў у скачкі на батуце, мастацкую гімнастыку, веславанне, бо там свае добрыя спартсмены. А там, дзе сваіх яркіх лідараў няма, запрашаем легіянераў, якія пакажуць, як трэба трэніравацца і працаваць. У трэнераў, бацькоў шмат амбіцый, усе спартсмены хочуць стаяць на п'едэстале. А трэніравацца цэлымі днямі не ўсе здольныя. Спорт — гэта катаржная праца, і каб быць найлепшым, трэба працаваць больш, чым усе астатнія. У спорце найвышэйшых дасягненняў адна мэта — быць найлепшымі, і няхай у некаторых відах вынікі пакуль паказваюць легіянеры.

Многія спартсмены сёння становяцца найлепшымі ў краіне і спыняюцца. А калі прыязджае 10-ы чалавек з той жа Расіі, аказваецца, што ён лепшы за нашага чэмпіёна. Возьмем, напрыклад, біятлон. Калі Дар'я Домрачава і Надзея Скардзіна скончылі кар'еры, найлепшай у краіне стала Ірына Крыўко. На чэмпіянатах Еўропы была 50-я, але ж у краіне найлепшая, зарплату атрымлівае, за месца ў камандзе змагацца не трэба, усё добра. Прывезлі дзвюх спартсменак, і Іры прыйшлося змагацца за месца ў камандзе. У кожным відзе спорту павінна быць унутраная канкурэнцыя: яна не дае расслабіцца.

***— Паколькі на легіянераў ускладаецца задача паказваць прыклад, то і патрабаванні да іх павінны быць вышэйшыя...***

— Абсалютна правільна. Да іх вышэйшыя патрабаванні, і плацім мы ім больш. Тыя ж хакеісты ў мінскім «Дынама» апраўдваюць чаканні. У некаторых футбольных клубах замежнікі таксама апраўдваюць чаканні, на нашым узроўні. Можна было б купіць легіянераў у кожны футбольны клуб. Але дзе браць грошы? Для гэтага патрэбны вялікія сродкі. Нашы футбольныя клубы не зарабляюць на білетах, на маркетынгавых праграмах. Грошы ад дзяржавы ўсе хочуць атрымліваць, а толку не паказваюць. Купіць футбаліста можна, але найперш трэба выхоўваць сваіх.

***— Значыць, запрашэнне легіянераў сітуацыю ў беларускім футболе не выратуе?***

— Мы сёння кажам, што ў нас футбол прасеў. Але, шчыра кажучы, у нас яго ніколі асабліва і не было. Я жыву больш за 50 гадоў і не ўспомню, калі нашы футбалісты выйгралі нешта значнае, за выключэннем 1982 года, калі мінскае «Дынама» стала чэмпіёнам СССР. Усе шукаюць прычыну ў чым заўгодна, толькі не ў сабе. То грошай мала далі, то поле дрэннае, то яшчэ нешта. Але ніхто не думае, што можа быць мала трэніровак, няправільныя методыкі. Ва ўнутранай сістэме трэба шукаць прычыну. Няўжо Данія, якая выступае на чэмпіянатах Еўропы, мае больш грошай і лепшыя ўмовы? Сумняваюся. Проста ў іх іншы падыход. Значыць, нашым спецыялістам трэба пачынаючы з дзіцячага спорту разбірацца, што робіцца правільна, а што — не, якія методыкі прымяняюцца, пераглядаць планы трэніровак, што на іх адпрацоўваецца. У нашых футбалістаў па адной трэніроўцы ў дзень, і гэта для іх нармальна. А ў ідэале іх павінна быць дзве-тры. Таму як працуюць, такія і вынікі.

***— А калі міністр стукне кулаком па стале і скажа праводзіць па дзве трэніроўкі на дзень?***

— Яны напішуць план на паперы, але гэта не значыць, што стануць яго прытрымлівацца. Павінна быць выбудавана адзіная сістэма ад дзіцячага спорту да нацыянальнай каманды. І займацца гэтым павінна федэрацыя, клубы. І паступова яны пачынаюць гэта рабіць.

***— Сяргей Міхайлавіч, многа робіцца для развіцця футбола і хакея. Але ёсць іншыя віды спорту, якія маюць багатыя медальныя традыцыі, а сёння знаходзяцца ў заняпадзе. Напрыклад, спартыўная гімнастыка, фехтаванне. Крыўдна губляць такую гісторыю.***

— Каб падрыхтаваць спартсмена, патрэбен не адзін год, а зламаць сістэму можна вельмі хутка. І, як відаць, у нейкі момант мы яе зламалі, не ўдзяляючы гэтым відам спорту належнай увагі. Многія нашы спартсмены выехалі за мяжу, паехалі па доўгі рубель. Гэта яшчэ і паказчык патрыятызму: тут у іх уклалі, імі займаліся, а як толькі нечага дасягнулі, адразу з'ехалі. Але гэта іх выбар. Так, для дзяржавы гэта страта. Былі б тут выдатныя спецыялісты, магчыма, было б лепей. А можа, і не страта. Практыка паказвае, што не заўсёды добрыя спартсмены становяцца добрымі трэнерамі.

**«Нам сёння нельга распыляць сродкі на ўсе віды спорту. Для кожнага свой спорт будзе самы важны, гэта зразумела. Але мы не можам забіраць грошы ў людзей і аддаваць іх на хобі спартсменаў ці трэнераў. Вядома, працасцей быць трэнерам ва ўмоўным бадмінтоне, чым працаваць на заводзе ці араць поле».**

***— Цяпер гэтыя віды спорту трэба падымаць з нуля?***

— Практычна так, трэба ўдасканальваць, падымаць сістэму, чым мы сёння і займаемся. Мы вызначылі пяць відаў, на якія трэба звярнуць пільную ўвагу: кулявая стральба, веласіпедны спорт, гімнастыка спартыўная, плаванне, фехтаванне. У гэтых відах спорту разыгрываецца найбольшая колькасць медалёў на Алімпійскіх гульнях, і ў гэтых відах у нас вялікія медальныя традыцыі. І мы абавязаны іх адрадзіць і вывесці на той узровень, на якім яны павінны быць. Гэта справа не на год і не на два, магчыма, спатрэбіцца два алімпійскія цыклы. Але агульнымі намаганнямі мы павінны гэта зрабіць.

***— Каб падымаць спорт, патрэбен рэзерв. У дзіцяча-юнацкіх школах хапае аддзяленняў па гэтых відах?***

— Так, вядома. Напрыклад, у Брэсце развіваецца фехтаванне, у Барысаве і Гродне — стральба, у Рэчыцы — велаcпорт. Секцый і аддзяленняў дастаткова. Але не заўсёды эфектыўнасць іх працы адпавядае патрабаванням. Па кожным відзе спорту мы распрацавалі канцэпцыі, усяго іх 47. Дакладна вызначылі рэперныя пункты ў рэгіёнах. Вызначылі, дзе трэба закупіць інвентар, знайсці трэнераў, даць ім методыкі.

***— Сяргей Міхайлавіч, галоўнай праблемай сусветнага спорту па-ранейшаму застаецца допінг. Але на нядаўняй Алімпіядзе ў беларусаў праблем з гэтым не было, усё менш з'яўляецца навін аб дыскваліфікацыі спартсменаў. Барацьба з допінгам дае вынікі?***

— Сваю ролю сыграў Указ Прэзідэнта «Аб супрацьдзеянні допінгу ў спорце», падпісаны два гады таму. Згодна з ім, вінаватых ва ўжыванні забароненых прэпаратаў абавязваюць вярнуць фінансавыя сродкі, якія патрацілі на падрыхтоўку спартсмена, і нават могуць прыцягнуць да крымінальнай адказнасці. Страх усё страціць аказаўся мацнейшым за жаданне прыняць нейкі прэпарат, каб паказаць вынік. Спорт — гэта як вайна, а на вайне ўсе сродкі добрыя. І спартсмен выкарыстоўвае ўсе метады, каб перамагчы, некаторыя ўжываюць допінг. Пры тым, што адным гэта дазволена, а іншым — не. Чаму ўсе сусветныя лідары ў лыжах сталі астматыкамі і прымяняюць прэпараты, якія для іншых забароненыя? Дык, можа, і нам усіх астматыкамі зрабіць? Тут вельмі шмат пытанняў. Спорт, на жаль, не заўсёды чысты. І двайныя стандарты, якія прымяняюцца ў палітыцы, выкарыстоўваюцца і ў спорце.

***— Ваш расійскі калега Алег Матыцын у інтэрв'ю Уладзіміру Познеру сказаў, што канчатковае рашэнне аб прыняцці забароненага прэпарату прымае спартсмен. Вы з гэтым згодны і якую адказнасць у такім выпадку павінен несці трэнер?***

— Мне здаецца, спартсмен не заўсёды ведае, што ён прымае. За фармакалогію адказвае трэнер, медыцынская група, і спартсмен можа не ведаць, які прэпарат яму даюць. Нездарма мы ў сваіх дакументах прапісалі, што аднолькавую адказнасць нясуць спартсмен і трэнер. Але, калі дакладна даказана, што спартсмен не ведаў, а рашэнне выкарыстаць забаронены прэпарат прыняў трэнер, адказнасць нясе толькі ён. Такое таксама здараецца.

***— Напярэдадні зімовыя Алімпійскія гульні 2022 года ў Пекіне. Чаго асабіста вы чакаеце ад гэтай Алімпіяды?***

— Мы ўжо ведаем, у якіх умовах будзе праходзіць гэтая Алімпіяда. Ведаем, як Кітай ставіцца да эпідэміялагічных мер. Я думаю, у гэтым плане будзе складаней, чым у Токіа. І ўсе павінны быць маральна да гэтага падрыхтаванымі. Я ўпэўнены, што Кітай зробіць усё магчымае і немагчымае, каб правесці Гульні на самым высокім узроўні. На медалі ў нас могуць прэтэндаваць традыцыйныя віды спорту: біятлон, фрыстайл. Сёння можам казаць пра канькабежны спорт, лыжныя гонкі. Медалі могуць быць, а могуць і не быць, і гэта трэба ўлічваць. Каманда ў нас баяздольная, але вельмі цяжка нешта загадваць. Таму я ніколі не раблю прагнозаў.

***— Сяргей Міхайлавіч, вы вядомы аматар бегу. А новыя спартыўныя захапленні для сябе адкрылі?***

— Я кансерватар, займаюся тым жа, чым і ўсё жыццё. Раз на тыдзень гуляю ў футбол, люблю рускі більярд. Пастаянна бегаю. Люблю пагуляць у валейбол, у настольны тэніс, але гэта калі ёсць жаданне і час. А часу, на жаль, цяпер мала.

***— Аднойчы ў інтэрв'ю вы расказвалі, што ў ваенным вучылішчы ўстанавілі «вечны рэкорд» на паласе перашкод. Яго пабілі, не ведаеце?***

— Я думаю, не. Я скончыў вучылішча ў 1989 годзе, у пачатку 2000-х туды прыязджаў, і рэкорд яшчэ трымаўся. І ён быў па савецкіх нарматывах. А сёння вучылішча ўжо не працуе.

***— Дайце, калі ласка, параду ад міністра спорту тым, хто з кожнага панядзелка збіраецца выйсці на прабежку.***

— Для таго каб займацца фізічнай актыўнасцю, трэба разумець важнасць бегу для свайго арганізма. Пры бегу працуе кожная мышца, кожны сустаў. Бег спрыяе рабоце сэрца, з яго дапамогай з арганізма выводзяцца розныя шкодныя рэчы. І да бегу трэба падыходзіць правільна, арганізму павінна быць камфортна. Адчулі дыскамфорт — пераходзьце на хадзьбу. Пачынаць варта з невялікіх адлегласцяў: 200, 300, 500 метраў. І наступіць дзень, калі будзе ў задавальненне і 10 кіламетраў прабегчы. Усё трэба рабіць паступова і праяўляць сілу волі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота з архіва Міністэрства спорту і турызму.**

Спорт-тайм: наш фармат

## Тыдзень развіцця і новых мэт

**У спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем актуальныя навіны**




**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Беларускія баксёры выступілі на чэмпіянаце Еўропы да 18 гадоў. Трое спартсменаў сталі прызёрамі турніру. Мацвей Давыдаў (вагавая катэгорыя 63 кг) заваяваў сярэбраны медаль. Бронзавымі прызёрамі сталі Андрэй Масалаў (86 кг) і Мікіта Нагорны (92 кг).

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Жаночая нацыянальная зборная па хакеі на траве выступіла ў кваліфікацыі Кубка свету. Гэта першы ў гісторыі ўдзел беларускай каманды непасрэдна ў кваліфікацыі Кубка свету. У турніры ўдзельнічалі тры каманды з чэмпіянату Еўропы вышэйшага дывізіёна — Ірландыя, Італія і Шатландыя, пяць найлепшых каманд з чэмпіянату Еўропы другога дывізіёна — Беларусь, Польшча, Уэльс, Францыя і Расія. Сістэма розыгрышу кваліфікацыйнага тура — стыкавыя матчы. Першую гульню беларускі правялі супраць расійскай каманды і выйгралі яе з вынікам 7:1. Затым беларуская каманда сустрэлася з камандай Ірландыі, якой уступіла з вынікам 2:3. Пройгрышам для беларускай каманды скончыўся матч з Шатландыяй — 1:2.

**ЦЫТАТА ТЫДНЯ.** «Наша супрацоўніцтва ўжо доўжыцца некаторы час і з падпісаннем гэтага дакумента падымецца на якасна новы ўзровень. Асноўная мэта — праявдзенне пры дапамозе Прэзідэнцкага спартыўнага клуба мерапрыемстваў, якія дазволяць нам рэалізаваць галоўныя мэты, што стаяць перад рухам Special Olympics. Перш за ўсё гэта сацыяльная рэабілітацыя дзяцей з асаблівасцямі развіцця, прывіццё ім навыкаў здаровага спосабу жыцця і фарміраванне спартыўных навыкаў. Акрамя таго, гэта развіццё розных праграм пад эгідай Special Olympics: валанцёрскай, медыцынскай, бацькоўскай і вялікай колькасці іншых праграм спецыяльнага Алімпійскага руху ў нашай краіне», — адзначыла Ларыса Таболіна, выканаўчы дырэктар ГА «Беларускі камітэт «Спэшыал Алімпікс». Днямі грамадскае аб'яднанне і Прэзідэнцкі спартыўны клуб падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве. Беларускі камітэт «Спешыал Алімпікс» праводзіць шырокамаштабную работу па сацыяльнай рэабілітацыі асоб з асаблівасцямі інтэлекту праз заняткі спортам. Штогод аб'яднаннем праводзяцца рэгіянальныя і рэспубліканскія спаборніцтвы. Арганізоўваюцца спартыўныя трэніроўкі і адборачныя спаборніцтвы з мэтай падрыхтоўкі зборнай Рэспублікі Беларусь да еўрапейскіх і міжнародных спецыяльных Алімпійскіх гульняў.

**ПАЗІЦЫІ ТЫДНЯ.** Беларуска Арына Сабаленка захавала за сабой другое месца ў абноўленым рэйтынгу Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). На мінулым тыдні найлепшая беларуская тэнісістка выйграла толькі адзін матч на турніры ў Маскве і страціла 365 рэйтынгавых ачкоў. Цяпер у яе 6750 балаў. Вікторыя Азаранка апусцілася на адну пазіцыю і заняла 27-е месца (2201 бал). Аляксандра Сасновіч знаходзіцца на 86-м радку (850), Вольга Гаварцова займае 134-е месца (567). У рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў (ATP) беларус Ілья Івашка займае 46-е месца (1253 ачкі), у Ягора Герасімава 105-я пазіцыя (744). На гэтым тыдні абодва беларускія тэнісісты выступаюць на турніры катэгорыі ATP-250 у расійскім Санкт-Пецярбургу.

**НЯЎДАЧА ТЫДНЯ.** Хакеісты мінскага «Дынама» ўступілі «Амуру» ў матчы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі. Матч у Хабараўску скончыўся з вынікам 0:3.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

БТА БАНК

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ОКТЯБРЯ 2021 Г.

**Наименование банка ЗАО «БТА Банк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 9 949 | 10 372 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 38 254 | 37 834 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 18 434 | 40 633 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 76 290 | 74 358 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 235 515 | 258 453 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 4 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 11 775 | 11 542 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | 791 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 181 | 195 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 873 | 1 423 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 393 271 | 435 605 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 14 708 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 34 694 | 68 564 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 277 380 | 299 418 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 13 679 | 15 524 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | 2 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 795 | 1 088 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 341 256 | 384 596 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 462 | 1 378 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 9 426 | 9 372 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 16 380 | 15 512 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 52 015 | 51 009 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 393 271 | 435 605 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ОКТЯБРЯ 2021 Г.

**Наименование банка ЗАО «БТА Банк»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2021 | 01.10.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 24 036 | 22 029 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 17 159 | 13 265 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 877 | 8 764 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 6 248 | 4 401 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 357 | 1 239 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 891 | 3 162 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (203) | 213 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 3 023 | 2 466 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (76) | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3 745 | 3 562 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 1 319 | 209 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 10 579 | 9 045 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 569 | 613 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 938 | 1 594 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 | 120 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 937 | 1 474 |



Председатель Правления Доронкевич А.В.

Главный бухгалтер Паденова Л.Б.

Дата подписания: 05 октября 2021 г.

УНП 807000071

# Извещение о проведении повторного открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70, +375 29 6139869 |

**Предмет аукциона**

**Адрес: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/ 12**
**Лот № 1**

| Наименование | Об. пл. | Инвен. номер |
|---|---|---|
| **Производственно-складское помещение** | 893,9 кв. м. | 500/D-798186687 |
| **Складское помещение** | 1127,4 кв. м. | 500/D-798186686 |

**В состав лота входит оборудование:** перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 803 308,80 дол. США** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона – **40 165,44 дол. США**

**Лот № 2**

**Ограждение бетонное** (инв. номер 980773)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 4 896,00 дол. США** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона – **244,80 дол. США**

**Сведения о земельном участке по лотам № 1 и № 2:** пл. 0,8393 га предоставлен продавцу на праве общего долевого постоян. пользования (доля: 9/20). **Ограничения (обременения) прав:** охранные зоны линий связи и радиофикации (пл. 0,0883 га), электрич. сетей (пл. 0,1015 га), сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4060 га) и канализации (пл. 0,0580 га).

**Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70**
**Лот № 3**

| | | |
|---|---|---|
| **Административное, производственное** | 2007,2 кв. м | 500/С-21619 |

**В состав лота входит оборудование:** перечень см.на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by).

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 1 029 768,96 дол. США** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона – 51 488,45 дол. США

**Лот № 4**

В состав лота входят: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. номер 30121)

**Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 4 809,60 дол. США** (снижена на 20 %)
Шаг аукциона – **240,48 дол. США**

**Сведения о земельном участке по лотам № 3 и № 4:** пл. 0,3600 га предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. **Ограничения (обременения) прав:** охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

**Лоты №№ 5-21 – оборудование и транспортное средство, бывшие в употреблении**
**Месторасположения: г. Минск, пр. Пушкина, д. 70**

| Лот № | Наименование | Инвен. № | Начальная цена* (с НДС 20 %), дол. США | Шаг аукциона, дол. США |
|---|---|---|---|---|
| **5** | Аппарат гидроабразивной резки | 70103 | 54528,00 | 2726,40 |
| **6** | Аппарат плазмен. резки CUT120 IGBT | 70074 | 422,40 | 21,12 |
| **7** | Вертикальный обрабат. центр с ЧПУ ECO CENTER 350 CNC с системой управления GPPlus 450 | 70089 | 20160,00 | 1008,00 |
| **8** | Обрабат. центр(Si) Vector1500 CNC*CNC | 41031 | 47136,00 | 2356,80 |
| **9** | Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124 | 70124 | 53568,00 | 2678,40 |
| **10** | Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4 | 41028 | 34944,00 | 1747,20 |
| **11** | Станок радиально-сверлильный 2К522 | 41022 | 3168,00 | 158,40 |
| **12** | Станок специ. ленточно-отрез. МП6-1570 | 41007 | 1536,00 | 76,80 |
| **13** | Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133 | 70179 | 743040,00 | 37152,00 |
| **14** | Токар. станок с индикатором положения Turnado 280/1500 | 41033 | 3 888,00 | 194,40 |
| **15** | Токар. станок с ЧПУ Fanuc Oi-Mate с накладной станиной Compact 330 | 41034 | 26112,00 | 1305,60 |
| **16** | Широкоунивер. фрезерный станок с УЦИ ZX 635ОС | 41025 | 4515,84 | 225,79 |
| **17** | Автомобиль MAZ 437 143 329-00 (рег. знак АР 0818-7) | - | 8 380,00 | 419,00 |
| **18** | Станок Hedelius -CB 80 Magnum | 70147 | 72960,00 | 3648,00 |
| **19** | СТАН СП-2000 | 41008 | 122901,00 | 6145,05 |
| **20** | Станок консольно-фрезерный ВМ127М | 41019 | 7 741,44 | 387,07 |
| **21** | Станок отрезной ДОС | 41012 | 259,20 | 12,96 |

Цены снижены по лотам №№ 5–21 на 20 %

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона** проводится за счет покупателя. Продавец и организатор аукциона не оказывают услуг по демонтажу и вывозу предмета аукциона

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в т.ч. документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения аукциона.
С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации или явки на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику, при его согласии, по начальной цене увеличенной на 5 %.

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок заключения договора купли-продажи – 10 (десять) дней** после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2,5 % от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в г. «Звязда» 05.10.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона по лотам №№ 1–21** | 08.11.2021 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата, время начала и окончания приема заявлений по лотам №№ 1–21** | С 09.00 26.10.2021 до 17.00 05.11.2021, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

# Извещение о проведении 26 ноября 2021 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | |
|---|---|---|
| **Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества** | **Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС*** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| Квартира общей площадью 148,1 кв. м с инвентарным номером 500/D-605192, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, 28-139, наименование – квартира 139, назначение – квартира; изолированное помещение общей площадью 40,9 кв. м с инвентарным номером 500/D-708113334, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Некрасова, 28-264, наименование – чердачное помещение, назначение – помещение неустановленного назначения | 451 400,00 | 45 000,00 |

*Сумма НДС составляет 16 066,67 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «МТЗ», 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 29.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 26.11.2021.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 40 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 26 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.10.2021 по 24.11.2021 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 363 38 42; (017) 333-49-67.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36, (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 333-49-67 (ОАО «МТЗ»).

Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

Чыстыя стасункі

# ПРЫБРАЦЦА І АЗЕЛЯНІЦЦА

## У гарадах, на сельгаспрадпрыемствах, могілках, уздоўж трас і ў дварах

**Івацэвічы, Скідзель, Горкі, Касцюковічы, Слаўгарад, Зэльва і Карэлічы сёлета будуць азеленены на 40 %, а да 2025-га ўсе райцэнтры і абласныя гарады Беларусі таксама набудуць такі паказчык. Да канца года ў краіне таксама павінны ліквідаваць усе міні-палігоны для адходаў і рэкультываваць не менш як 160 міні-палігонаў. Гэтыя і іншыя планы і вынікі па добраўпарадкаванні тэрыторый і навядзенні парадку на зямлі агучылі спецыялісты Мінпрыроды і ЖКГ.**




### Саджаць, даглядаць, знішчаць

Пра азеляненне тэрыторый і рэгуляванне распаўсюджвання колькасці інвазійных раслін (баршчэўніку і сумніку канадскага) расказаў **Мікалай СВІДЗІНСКІ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці — начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

*— У межах мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі у гарадах і вёсках пасаджана больш за 222 тысячы дрэў і звыш 181 тысячы кустоў. А 17 верасня сёлета ў Лошыцкім парку з удзелам кіраўніка Мінпрыроды Андрэя Худыка з'явіўся трохмільённы саджанец. Гэтае дрэва прысвяцілі трылогіі Года малой радзімы (2018—2020 гг.) і Году народнага адзінства (2021 г.).*

У Барысаве да гэтай даты з'явілася алея Адзінства, у Жодзіне і Старых Дарогах — скверы Народнага адзінства, у Лагойску — алея Абаронцаў Айчыны. Мінскі абласны камітэт прыродных рэсурсаў у межах новай святочнай даты пасадзіў бярозавую алею ўздоўж аўтадарогі вёскі Валодзькі Уздзенскага раёна, расказала **Юлія МЯЦЕЖ, начальнік аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, нетраў, біяразнастайнасці і асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

83 % райцэнтраў і абласных гарадоў краіны ўжо азяленены, згодна з нарматывамі, на 40 %. Насельніцтва актыўна адгукаецца на ўдзел у мерапрыемствах па азеляненні, закладваюцца паркі, алеі, скверы. За апошнія тры гады высаджана каля трох мільёнаў дрэў. Аднак наступны паліў і догляд саджанцаў, у тым ліку з боку арганізацый, якія павінны адказваць за ўтрыманне гэтых тэрыторый, пакуль «кульгае».

Плошча баршчэўніка Сасноўскага, хоць пакрысе і памяншаецца, аднак дагэтуль гэты «драпежнік» займае 4345 гектараў. Мікалай Свідзінскі заклікаў людзей дапамагаць спецыялістам і змагацца рылдлёўкай з непрошаным госцем хоць бы на ўласных участках.

Час сумніку — прыгожай, але небяспечнай жоўтай расліны, якую раней высаджвалі дзеля аздаблення тэрыторый, — жнівень і верасень. Цяпер ён шырока распаўсюдзіўся, найперш у Гродзенскай і Мінскай абласцях. Нашмат менш яго на Віцебшчыне. «Нашай фаўне ён пастаянна наносіць шкоду, таму з ім таксама трэба змагацца», — адзначае спецыяліст.

### Устанавіць сметніцу і агароджу, знесці дом і калодзеж

Пытанне навядзення парадку на зямлі комплекснае і ўключае ў сябе дзейнасць па добраўпарадкаванні, азеляненні, утрыманні і падтрыманні тэрыторый у чысціні, заўважыла **Кацярына НЯСЦЮК, кансультант упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды:**

*— Урад штогод зацвярджае план па навядзенні парадку на зямлі, які ўтрымлівае звыш 70 мерапрыемстваў. Яны скіраваны на добраўпарадкаванне і ўтрыманне тэрыторый населеных пунктаў, сельскагаспадарчых аб'ектаў, зямлі ўздоўж аўтамабільных і чыгуначных трас, месцаў пахавання, адпачынку, лясного фонду, садаводчых таварыстваў, гаражных кааператываў і іншых. Сёлета пераглядаюцца крытэрыі па навядзенні парадку на зямлі і пералік мерапрыемстваў, які дапоўніцца комплексным уладкаваннем водных аб'ектаў, велаcіпедных стаянак і парковак, рамонтам нецэнтралізаваных сістэм пітнога водазабеспячэння, ліквідацыяй закінутых калодзежаў.*

У сельскай мясцовасці ўладкавана больш за 4000 прыдомавых тэрыторый, куды ўключаны спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі. Устаноўлена ці адрамантавана больш як 2,5 тысячы кантэйнерных пляцовак для збору адходаў, а таксама 16 000 кантэйнераў, 6700 з якіх — для раздзельнага збору. Ліквідавана 2400 пустых і старых дамоў. Устаноўлена і адрамантавана агароджа на 400 фермах жывёлагадоўлі, 102 машынных дварах і 99 іншых сельскагаспадарчых аб'ектах. Знесена 80 неэксплуатуемых сельскагаспадарчых збудаванняў. У севазварот уцягнута больш за 18 гектараў вызваленых зямель. Праведзены ліквідацыйны тампанаж 144 невыкарыстоўваемых артэзіянскіх свідравін, рэкультывавана 122 адпрацаваныя ўнутрыгаспадарчыя кар'еры, удакладніла Кацярына Нясцюк.

### Шкода наваколлю — тры мільёны рублёў

Сёлетняя задача па закрыцці ўсіх міні-палігонаў краіны — вялікі аб'ём работ, які патрабуе шмат намаганняў. Мясцовым органам улады сумесна з арганізацыямі ЖКГ неабходна перагледзець схему абыходжання з камунальнымі адходамі таксама да канца года, удакладніла Кацярына Нясцюк:

*— У межах кантролю за навядзеннем парадку на зямлі Мінпрыроды правяло больш за 21 тысячу кантрольных мерапрыемстваў і выявіла 37 тысяч парушэнняў. 1949 вінаватых у парушэнні парадку на зямлі асоб прыцягнута да адміністрацыйный адказнасці на суму 798,9 тысячы рублёў. Устаноўлена 545 фактаў нанясення шкоды наваколлю, прад'яўлена прэтэнзій на пакрыццё гэтай шкоды амаль на тры мільёны рублёў.*

Па-ранейшаму актуальнымі застаюцца праблемы неналежнага санітарнага ўтрымання тэрыторый, несвоечасовага вывазу смецця і яго несанкцыянаванага складзіравання (10 700 звалак). Да адказнасці за гэта прыцягнутыя 468 асоб на суму 223 тысячы рублёў. 92 % такіх стыхійных звалак ужо ліквідаваны.

### Афарбоўка і паркоўка

У межах месячніка па санітарнай ачыстцы і добраўпарадкаванні Мінска наводзяць парадак у сталічных дварах і камунальніках. Яны займаюцца прыборкай тэрыторый, падвалаў і гарышчаў, вывазам лістоты, рамонтам дваравых праездаў. Запланаваны рамонт каля дзвюх тысяч адзінак гульнявога і спартыўнага абсталявання, малых архітэктурных формаў, каля 116 лесвіц, афарбоўка і рамонт 825 кантэйнераў для смецця.

*— За першае паўгоддзе ў дварах сталіцы высаджана 8280 дрэў і 25 378 кустоў. У межах месячніка запланавана пасадка яшчэ 2318 дрэў і 7842 кустоў,* — расказала **Вольга ЯГОРАВА, начальнік аддзела па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду Мінскай гарадской гаспадаркі.** *— Насельніцтва актыўна ўдзельнічае ў акцыі «Зялёны двор разам!». 1682 дрэвы і 4428 кустоў высаджана за паўгода сёлета разам з жыхарамі.*

Запланаваны таксама шэраг акцый. Сумесна з прадстаўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі мяркуецца праверыць правілы паркоўкі аўто ў дварах, а з «Фаўнай горада» — утрыманне дамашніх жывёлін. Адбудуцца і акцыі па зборы другасных матэрыяльных рэсурсаў. Уся інфармацыя аб арганізуемых суботніках размяшчаецца на сайтах жыллёва-камунальных службаў і інфармацыйных шыльдах каля пад'ездаў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона**

| Предметы торгов | Начальная цена продажи, руб. (без учета НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-10491 (наименование: изолированное помещение № 3; назначение: административное помещение), площадью 624,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Наганова, 10 | 409 600,00 | 40 960,00 |
| Лот № 2: изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-10492 (наименование: изолированное помещение № 4; назначение: административное помещение), площадью 688,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Наганова, 10-4 | 385 600,00 | 38 560,00 |

Продавец: Брестский ОК ОО «БРСМ», 224005, г. Брест, ул. Наганова, 10. Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. Срок заключения договора купли-продажи: в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с момента подписания протокола аукциона. Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Условия продажи: без условий. Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. Обременение: наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 18 ноября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно уточнить по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 17 ноября 2021 г. до 17.00

Утерянное свидетельство о государственной регистрации индивидуального предпринимателя на имя Городецкой Светланы Николаевны, УНП 190183058, считать недействительным.

Ликвидируется Первичная профсоюзная организация суда Барановичского района и города Барановичи Белорусского профсоюза работников государственных и других учреждений. Претензии принимаются в течение двух месяцев по адресу: ул. К. Маркса,19, каб. 43, 224005, г. Брест. Тел. 8-0162-53-93-06

УНП 200303369

**Извещение о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «КУПАЛИНКА», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

Здание бокса гаражей, инв. № 644/С-59172, общ. пл. 138 кв. м. Ограничения / обременения: аренда. Холодильная станция, инв. № 644/С-59422, общ. пл. 621,8 кв. м. Резервуар для воды, инв. номер 644/С-59421, общ. пл. 94,5 кв. м. Составные части и принадлежности: два дыхательных устройства. Адрес: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 58, 58/1, 58/2. Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 25.03.2120 для строительства и обслуживания здания и сооружений и объектов иного назначения, общ. пл. 0,4189 га. Начальная цена (с НДС 20 %) – 423 257,05 бел. руб. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, , получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.
Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 4 % от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» 14.10.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.11.2021 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 04.11.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by |

## Генерал-маёр Аляксандр ШКІРЭНКА:

# «ВА ЎСЕ ЧАСЫ БЫЛО ВАЖНА АДСЛУЖЫЦЬ У АРМІІ»

### Маладыя людзі ўсё часцей застаюцца ва Узброеных Сілах на кантрактнай аснове

**Учора пачалася адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы і іншыя воінскія фарміраванні. Гэтай восенню прызыўнікі крыху раней, чым звычайна, пераапрануцца ў ваенную форму, прыступяць да вывучэння воінскага статута і пройдуць курс маладога байца.**

Як ажыццяўляюцца мерапрыемствы прызыву падчас пандэміі, на якія прэферэнцыі, рэалізаваныя пры падтрымцы Прэзідэнта, могуць разлічваць тыя, хто адслужыў у войску, а таксама чаму сёння як ніколі важна аддаць доўг Радзіме, расказвае **начальнік галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення — намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Аляксандр ШКІРЭНКА.**



***— Аляксандр Іванавіч, з чым звязана тое, што маладыя людзі сёлета ідуць у армію на два-тры тыдні раней, чым гэта было ў апошнія гады?***

— Мерапрыемствы прызыву, як заўсёды, пачаліся пасля апублікавання Указа Прэзідэнта. Сёлета гэта адбылося ў жніўні, як і ў апошнія гады. Аднак адпраўку ва Узброеныя Сілы мы сапраўды пачалі раней. Калі ў мінулыя гады гэта была сярэдзіна лістапада, то цяпер у армію маладыя людзі пайшлі ўжо з учарашняга дня. Гэта зроблена з мэтай павышэння баявой падрыхтоўкі войскаў. На ранейшым этапе маладыя байцы пройдуць пачатковую ваенную падрыхтоўку і ўжо з новага навучальнага года (у арміі ён пачынаецца 1 снежня. — **Аўт.**), паўнавартасна ўступіўшы ў рады Узброеных Сіл і іншых воінскіх фарміраванняў, пачнуць займацца па поўнай праграме. Іх звальненне ў запас пачнецца раней. Маладыя людзі адслужаць роўна паўтара года, хто мае вышэйшую адукацыю — год: ні больш ні менш.

**«Чым раней малады чалавек выканае свой доўг перад Радзімай, тым больш упэўнена ён зможа планаваць сваё далейшае жыццё».**

***— Як праводзіцца прызыўная кампанія падчас чацвёртай хвалі каранавіруснай інфекцыі?***

— Эпідэмічныя мерапрыемствы ажыццяўляюцца яшчэ на стадыі ваенкаматаў. Больш паглыбленае медыцынскае абследаванне прызыўнікоў крыху зацягваецца ў сувязі з загружанасцю медыцынскіх устаноў. Пасля прыбыцця ў воінскія часці каранцін для новага папаўнення не прадугледжаны: маладыя людзі ў любым выпадку на працягу месяца будуць знаходзіцца адасоблена. Вядома, працягнуцца эпідэмічныя мерапрыемствы, вайскоўцам прапануюць вакцынавацца. Ніхто нікога прымушаць не будзе: прышчапіцца можна будзе па ўласным жаданні. Гэта ўжо не першы прызыў ва ўмовах пандэміі. Мы робім усё дзеля таго, каб ніка захваральнасці ў арміі не адбылося.

***— Ці прадугледжана спыніць або абмежаваць наведванні вайскоўцаў роднымі?***

— Да прыняцця прысягі сустрэчы з блізкімі традыцыйна абмежаваныя. Далейшае рашэнне па наведванні будзе прынята зыходзячы з абстаноўкі, якая на той час складзецца ў краіне. Першая прысяга ва ўмовах пандэміі прайшла без прысутнасці родных вайскоўцаў, але мы максімальна інфармавалі іх сем'і: вяліся прамыя трансляцыі з месцаў прысягі, выкладваліся ў інтэрнэце відэа. Вясной прысяга праходзіла ўжо ў звычайным фармаце. З папраўкай на масачны рэжым.

***— Пераходзячы ад часовых да больш глабальных праблем... Яшчэ некалькі гадоў таму ў армію ішлі дзеці 1990-х. Адпаведна, улічваючы нізкую нараджальнасць у канцы мінулага стагоддзя, адчуваўся недахоп прызыўнікоў. Ці змянілася сітуацыя, калі сталі прызывацца маладыя людзі, якія з'явіліся на свет ужо ў новым стагоддзі?***

— Кардынальна сітуацыя не памянялася. Мы па-ранейшаму знаходзімся на самым дне дэмаграфічнай ямы. Паступова падымацца ўверх пачнём прыкладна толькі ў 2025 годзе. Дэмаграфічная абстаноўка таго часу не толькі адбіваецца на колькасных паказчыках у арміі. Яна яскрава праглядаецца і падчас уступнай кампаніі ў ВНУ, калі жадаючых вучыцца з кожным годам становіцца ўсё менш. Для нас гэта не з'яўляецца вялікай праблемай: дастатковая колькасць прызыўнікоў ідзе на службу па кантракце. Застаюцца ў войску і тыя, хто пасля заканчэння тэрміновай службы ўжо павінен звальняцца. Больш чым 30 % пасад салдат і сяржантаў сёння ўкамплектавана ваеннаслужачымі па кантракце.

***— Гэта таксама своеасаблівае ноу-хау, калі вы прапаноўваеце прызыўнікам замест тэрміновай службы адразу ісці ў армію на кантрактнай аснове...***

— У свой час тыя, хто ішоў на службу ў міліцыю або ў МНС, вызваляліся ад тэрміновай службы ў войску. Атрымлівалася, што ў гэтым плане Узброеныя Сілы заставаліся абдзеленыя. Таму было прынята рашэнне прапанаваць прызыўнікам замест тэрміновай службы адразу служыць па кантракце, але два гады. Гэтыя змяненні ў заканадаўства былі ўнесены яшчэ ў 2014 годзе, але актыўна такой прывілеяй маладыя людзі не карысталіся. Цяпер мы зацікаўлены застацца ў арміі прафесійна. Некаторыя нават перажываюць, што ў сувязі са сваім станам здароўя або маральна-дзелавымі якасцямі непрыдатныя для кантрактнай службы. Аднаго жадання мала. Ёсць воінскія часці, дзе конкурс на адно месца складае пяць чалавек.

***— А як спрацавала нававўвядзенне мінулай прызыўной кампаніі, калі вы прапанавалі студэнтам-аграрыям «закрыць» сваё пытанне з арміяй падчас летніх канікулаў? Ці з ахвотай будучыя спецыялісты сельскагаспадарчага профілю карысталіся такой магчымасцю?***

— Першы этап службы ў войску гэтым летам ужо прайшлі 50 студэнтаў аграрных ВНУ. Гэтую практыку мы будзем працягваць. Чалавек, які мэтанакіравана рыхтуецца да работы ў сельскай гаспадарцы, павінен там пэўны час і адпрацаваць. Калі ж мы яго пасля заканчэння ВНУ або сярэдняй спецыяльнай установы адразу адпраўляем у армію, то праз год-паўтара, як правіла, у сельскай гаспадарцы спецыяліст ужо будзе незапатрабаваны.

***— На працягу многіх гадоў атрыманне адукацыі з'яўляецца самым папулярным відам адтэрміноўкі...***

— Сапраўды, гэта звыш 80 % ад усіх адтэрміновак. Цяпер малады чалавек прызыўнога ўзросту адтэрміноўку на атрыманне адукацыі можна выкарыстаць аднакратна. Гэта звязана з тым, што многія людзі карысталіся магчымасцямі адукацыі, каб проста не служыць у арміі. Адна ступень адукацыі, другая, трэцяя — і маладому чалавеку спаўнялася 27 гадоў, па дасягненні якіх у армію не прызываюць. А калі і заставаўся яшчэ нейкі час, то гэта таксама не было яму на карысць: пасля 25 гадоў мужчынам цяжка ісці ў армію. У 18 гадоў, калі арганізм фарміруецца, армейскае асяроддзе іх толькі загартоўвае. У такім узросце лягчэй адаптавацца да службы. І чым раней малады чалавек выканае свой доўг перад Радзімай, тым больш упэўнена ён зможа планаваць сваё далейшае жыццё. Выключэннем з'яўляюцца будучыя ўрачы. Раней, атрымаўшы дыплом, выпускнік медыцынскіх ВНУ прызываўся ў армію. А ўрачом ён стане толькі тады, калі на працягу года пройдзе інтэрнатуру. Атрымлівалася, калі мы яго прызывалі ў армію, чалавек траціў сваю кваліфікацыю. Цяпер гэтыя людзі вызваляюцца ад службы ў войску. Гэта для нас некрытычна. Усе медыкі падчас свайго навучання праходзяць ваенна-медыцынскую падрыхтоўку і выпускаюцца лейтэнантамі медыцынскай службы запасу.

***— Не сакрэт, што нямала маладых людзей з'ехала з краіны. Большасць з іх не выканала свой абавязак перад Радзімай. Што іх чакае пасля вяртання ў Беларусь?***

— Калі людзі з'ехалі для пастаяннага пражывання за межамі Рэспублікі Беларусь афіцыйна (гэта значыць атрымалі пашпарт серыі РР), яны здымаюцца з воінскага ўліку і ніякіх пытанняў у нас да іх не ўзнікае. Тыя, хто знаходзіцца ў іншых краінах неафіцыйна, адпаведна, ухіляюцца ад мерапрыемстваў прызыву. Заканадаўствам прадугледжана, што калі чалавек з якіх-небудзь прычын не з'яўляецца ў ваенкамат і яго не могуць адшукаць на тэрыторыі нашай краіны, ён уносіцца ў базу даных на абмежаванне права выезду. Гэта азначае, што як толькі малады чалавек вяртаецца ў Беларусь, назад ён ужо не выедзе. Акрамя таго, распачынаецца крымінальная справа за ўхіленне ад воінскай службы. Адметны факт: у большасці выпадкаў маладыя людзі, якія не хочуць служыць, з'яўляюцца непрыдатнымі па стане здароўя.

***— У свой час шырокі рэзананс выклікала прыняцце закона «Аб альтэрнатыўнай службе». Ці запатрабаваны такі від службы ў маладых людзей?***

— За вясенні прызыў на альтэрнатыўную службу па ўсёй краіне былі накіраваны 10 чалавек. Як правіла, гэта тыя людзі, якія не могуць выконваць воінскі абавязак паводле рэлігійных перакананняў. Аднак шмат прыкладаў і таго, калі маладыя людзі адмаўляюцца ад альтэрнатыўнай службы і ідуць служыць ва Узброеныя Сілы. Ёсць у нас катэгорыя людзей, якая ваенную прысягу не прымае. У той жа час яны вельмі добрасумленна выконваюць свае абавязацельствы.

***— Прыярытэтам у прызыўнікоў на працягу многіх гадоў карысталіся сілы спецыяльных аперацый, паветрана-дэсантныя войскі, разведка. Ці не змяніліся ў маладых людзей перавагі?***

— Прызыўнік — малады чалавек, у якога ў душы вельмі шмат рамантыкі. А яна, на іх думку, характэрная менавіта для пералічаных воінскіх падраздзяленняў. На дадзены момант вялікім попытам у прызыўнікоў карыстаецца «айці-рота». Аднак туды можа трапіць не кожны: патрэбна падыходзіць па здароўі, мець адпаведную адукацыю і вопыт работы. Выбіраем толькі найлепшых! Калі ў спецназ ідуць больш фізічна моцныя хлопцы, то ў «айці-роту» — «галавастыя».

***— Цяпер для тых, хто адслужыў у арміі, дзейнічае шмат прывілей...***

— І адна з іх — захаванне рабочага месца: чалавека, які звольніўся, абавязаны ўзяць на тое ж месца, з якога ён сыходзіў на ваенную службу. Гэта і пазаконкурсная залічэнне пры паступленні ў Ваенную акадэмію і шэраг грамадзянскіх навучальных устаноў пры сярэднім бале атэстата «шэсць» і больш, і бясплатныя курсы для падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ, і першачарговае вылучэнне інтэрната падчас навучання. Калі чалавек выплачвае крэдыт, то на перыяд службы ў войску выплаты прыпыняюцца. Іншае пытанне — не заўсёды маладыя людзі, якія адслужылі ў войску, ведаюць свае правы.

***— А ці правільна гэта — служыць Айчыне за бонусы?***

— Чалавек, які выконвае свой канстытуцыйны абавязак, павінен нешта атрымаць узамен. Тыя, хто ў армію не пайшоў, працуюць, зарабляюць грошы, атрымліваюць пэўныя льготы. Вайсковая служба мае свае абмежаванні, таму пэўная кампенсацыя павінна быць. Вельмі востра стала пытанне, калі паднялі страхавы стаж. Многія абураліся: чаму тэрміновая служба ў яго не залічваецца? Некалькі гадоў таму мы аднавілі справядлівасць, і цяпер час, праведзены ў арміі, абавязкова залічыцца пры налічэнні пенсіі ў будучыні.

***— З бягучага навучальнага года ва ўсіх школах краіны з'явіліся спецыялісты, адказныя за ваенна-патрыятычнае выхаванне. У большасці гэта афіцэры запасу...***

— Дадзенае пытанне доўга прасоўвала Міністэрства абароны. Я асабіста шмат ездзіў па ваенкаматах і школах. І, на мой погляд, было няправільна, што дапрызыўную падрыхтоўку ў некаторых з іх вялі жанчыны, якія ў арміі не служылі. Цяпер усё памянялася. Акцэнт — на выхаванні патрыётаў. І самая вялікая карысць у гэтым — ад энтузіястаў сваёй справы.

***— Пасля трагічнай гісторыі ў Печах, якая адбылася некалькі гадоў таму, ці трымаюцца на кантролі нестатутныя адносіны ў арміі?***

— Яны і раней кантраляваліся. Цяпер у тым ліку. Печы сёння — як піянерскі лагер. Салдаты, якія там пабывалі, просяцца застацца ў вайсковай часці на службу па кантракце. У бацькоў няма падстаў для хваляванняў. Тым больш, у тых жа Печах маладыя людзі атрымліваюць спецыяльнасць, якая потым можа спатрэбіцца ім і ў далейшым жыцці.

***— Сітуацыя ў свеце вымушае яшчэ раз гаварыць пра тое, наколькі важна сёння ўмець абараняць Айчыну. І калі некаторыя маладыя людзі ў гэтым яшчэ сумняваюцца, то відавочна, што бацькі толькі за тое, каб іх дзеці адслужылі ў войску...***

— Справа яшчэ і ў тым, што памянялася пакаленне. Яшчэ гадоў пяць таму ў армію, як правіла, ішлі дзеці, чые бацькі не служылі. Быў развал Савецкага Саюза, скарачалася колькаснасць Узброеных Сіл... Цяпер ідуць дзеці таго пакалення бацькоў, якія ў свой час выканалі абавязак перад Радзімай. Ва ўсе часы было важна адслужыць у войску. Кожны мужчына павінен умець трымаць у руках зброю, абараніць пры неабходнасці хоць бы свой дом, сваю сям'ю. А калі ён будзе здольны на гэта, то і за Радзіму не страшна.

Асоба

# «Я Ў АДКАЗЕ ЗА САЛДАТ...»

## Афіцэр, які, рызыкуючы сабой, выратаваў ад гібелі падначаленага, не лічыць свой учынак подзвігам

**На днях усю інфармацыйную прастору («Звязда» таксама пра гэта пісала) абляцела навіна: старшы лейтэнант падарыў другое жыццё вайскоўцу тэрміновай службы, які выпусціў з рук баявую гранату. Па гарачых слядах удалося высветліць толькі тое, што гэтая гісторыя, якая адбылася на вучэбным палігоне 11-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады, са шчаслівым канцом. Сёння мы падрабязна раскажам пра чалавека, які, рызыкуючы сабой, папярэдзіў трагедыю.**



Фота «Ваяр».

Адведаць Аляксея ХАРЛАМАВА ў ваенны медыцынскі цэнтр прыйшлі мінскія суворaўцы.

Аляксей Харламаў, які ўласна і з'яўляецца аўтарам подзвігу, яшчэ знаходзіцца ў 432-м галоўным ваенным клінічным медыцынскім цэнтры Узброеных Сіл. Адчувае намеснік камандзіра мотастралковай роты па ідэалагічнай рабоце сябе добра, але ў сувязі з напружанай эпідэміялагічнай абстаноўкай асабіста пазнаёміцца з вайскоўцам не атрымалася. Затое мы доўга размаўлялі па тэлефоне: бадзёры, жыццярадасны голас ніколькі не выдае таго, што яшчэ нядаўна ў целе гэтага чалавека знаходзілася каля 30 аскепкаў гранаты, а сам ён увогуле быў за некалькі крокаў (прычым у прамым сэнсе) ад смерці.

Той дзень Аляксей памятае ў дэталях. Гэта былі планавыя заняткі па баявой падрыхтоўцы, ваеннаслужачыя брыгады выехалі на палігон. Старшы лейтэнант кіраваў заняткамі па кіданні гранаты. Папярэдне ваеннаслужачыя паспяхова прайшлі тэарэтычную падрыхтоўку. Перш-наперш салдаты тэрміновай службы кідалі вучэбныя гранаты, потым процiпяхотныя гранаты «РГД-5». І толькі паказаўшы добрыя вынікі падчас выканання практыкаванняў, перайшлі да кідання гранаты «Ф-1», якую ў народзе называюць «лімонкай».

Супадзенне ці не, за некалькі хвілін да пачатку заняткаў Аляксей Харламаў, які добра азнаёмлены з правіламі бяспекі, выпадкова зачапіўся вачыма за плакат, які паведамляў, што ў выпадку падзення боепрыпасу ні ў якім разе нельга яго падымаць. Вайсковец адразу выбудаваў у галаве міні-план: як бы ён сябе паводзіў, калі б здарылася надзвычайная сітуацыя. Ніхто нават падумаць не мог, што адбудзецца яна ўжо праз некалькі гадзін...

Усё ішло па плане. Адзін за адным вайскоўцы спраўляліся з заданнямі. Афіцэр стаяў побач: кантраляваў працэс, даваў рэкамендацыі, як правільна кідаць гранату, у некаторых выпадках дапамагаў. Дайшла чарга і да таго салдата, з-за няўважлівасці якога магла здарыцца трагедыя.

— Ваеннаслужачы — малайчына, што не разгубіўся, — лічыць Аляксей Харламаў. — Ён уважліва слухаў мае каманды і добрасумленна выконваў тое, што я яму казаў. Пакуль салдат бег у небяспечнае месца, я адфутболіў гранату ў бок акопа (праўда, зусім крыху яна не дакацілася) і рынуўся за ім.

Далей усё было як у кіно. Адбыўся выбух. Афіцэр упаў на салдата, закрыўшы яго сваім целам. Затым цішыня...

— Ці праўда, што падчас выбуху ў чалавека перад вачыма пралятае ўсё жыццё? — пытаюся ў Аляксея.

— Сапраўды, гэта нешта перадсмяротнае, — прызнаецца ён. — Першая думка была: трэба жыць. Больш за ўсё я перажываў нават не за сябе: думаў, ці справіцца з гэтым болем мая мама, не хацеў прыносіць гора ў сем'і маіх родных і сяброў. Таму ўзяў сябе ў рукі і не дапусціў панікі.

Аляксей адразу зразумеў: паранены. Устаў, самастойна дайшоў да медыцынскага пункта. Першую дапамогу яму аказалі ў санчасці, затым за маладым чалавекам прыбыла машына з ваеннага медыцынскага цэнтра, дзе ўжо праз некалькі гадзін старшы лейтэнант быў прааперыраваны.

Ваеннаслужачыя брыгады ўпэўнены: калі б не бронекамізэлька і каска, якія былі на ім, усё магло скончыцца інакш. Ён жартуе, што яшчэ лёгка абышлося. Кажучы гэта, чалавек, які атрымаў траўму спіны, удар у галаву, асколачныя раненні канечнасцяў, — безумоўна, рэдкі аптыміст і жыццялюб. І гэта пры ўсім тым, што адзін аскепак нават заляцеў яму пад бронекамізэльку. На шчасце, жыццёва важныя органы не закранула.

Салдат тэрміновай службы ўвогуле шчасліўчык: нават ніякай драпіны не засталося. Тое, што сваім жыццём абавязаны камандзіру, вайсковец добра разумее: цяпер мае поўнае права адзначаць дзень нараджэння двойчы на год. А яшчэ Аляксей Харламаў, сам таго не падазраючы, зрабіў падарунак яго матулі: пазаштатная сітуацыя адбылася акурат напярэдадні Дня маці.

Сваёй жа маці афіцэр адразу пасля трагедыі патэлефанаваць не адважыўся. Перш звязаўся з сястрой, якая знайшла як паднесці ёй гэтую навіну. Праўда, супакоілася маці толькі тады, калі пачула сынаў голас. Яе можна зразумець. Жанчына выхоўвала сына адна. У свой час не хацела яго адпускаць вучыцца ў Мінскае ваеннае суворaўскае вучылішча: шкадавала — зусім жа яшчэ дзіця. Але на свой 12-гадовы ўзрост Аляксей быў вельмі сур'ёзны і мэтанакіраваны: ён з самага дзяцінства марыў насіць пагоны.

Пасля заканчэння суворaўскага малады чалавек паступіў у Ваенную акадэмію: пасля вучылішча гэта было нескладана. Не заўважыў, як праляцелі чатыры гады навучання. Па размеркаванні трапіў у вайсковую часць у Слоніме, адкуль да роднага пасёлка Поразава, што ў Свіслацкім раёне, — рукой падаць. Каб не выпадак з гранатай, то пасля службы акурат збіраўся наведаць маці, павіншаваць яе са святам.

— Калі можна было б вярнуць усё назад, паступілі гэтак жа? — цікаўлюся ў Аляксея напрыканцы размовы.

— А як інакш!? — здзіўляецца ён. — Я адказваю за жыццё і здароўе сваіх салдат. Адзінае: калі можна было б вярнуцца ў мінулае, я б падалей адштурхнуў гранату...

# «БЕЛАЯ ПЛЯМА» НАШАЙ ПАМЯЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БелТА.

У цяперашні момант раскопкі вядуцца на адным з сямі (па папярэдніх звестках) пахаванняў. Эксперты сцвярджаюць, што толькі ў адной яме могуць знаходзіцца астанкі больш чым васьмі тысяч чалавек. Ужо ўстаноўлена: забітыя яны былі выстралам у галаву. Людзі спрабавалі выбрацца з ямы — аб гэтым сведчыць размяшчэнне астанкаў. Аднак іх чакаў кантрольны выстрал зверху... Жорсткая расправа над людзьмі ажыццяўлялася тут на працягу ўсяго перыяду акупацыі.

— Мы думалі, што нашы папярэднікі зрабілі дастаткова для таго, каб устанавіць памятныя месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыялізаваць месцы масавых пакаранняў беларускага народа, — адзначыў падчас наведвання раскопак **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.** — Сапраўды, была зроблена вялізная работа, але маштаб гэтай трагедыі настолькі вялікі, што, напэўна, за ўсе пасляваенныя гады, Савецкага Саюза і часоў ужо незалежнасці Беларусі мы не змаглі дасягнуць стапрацэнтнага выніку, і з улікам новых фактаў і абставін, якія пастаянна адкрываюцца, на гэта спатрэбяцца яшчэ доўгія гады.

У памяць аб загінулых на дзявятым кіламетры Маскоўскай шашы ў савецкі час быў узведзены абеліск. Аднак пра гэта сёння мала хто чуў, а калі і бачыў помнік, наўрад ці атаясамліваў яго з вялізнай брацкай магілай, дзе спачывае дзясяткі тысяч ні ў чым не вінаватых грамадзян. Між іншым, назваць гэтае месца малавядомым нельга. Яно было ўстаноўлена Надзвычайнай камісіяй па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі БССР адразу пасля вайны.

Неўзабаве справядлівасць будзе адноўлена: кожны беларус, а таксама госці нашай краіны даведаюцца, што каля Мінска і ў самой сталіцы людзей масава знішчалі не толькі ў Трасцянцы, Масюкоўшчыне, Драздах... Буйное забойства ажыццяўлялася і тут, адразу за МКАДам, каля мікрараёна Уручча. У найбліжэйшы час памяць тых, хто тут спачывае, будзе ўвекавечана. Магчыма, створаць новы мемарыял.

Знаходкі, якія разам з астанкамі падымаюць вайскоўцы 52-га батальёна, сведчаць толькі аб адным: людзі, якія спачываюць у вялікай брацкай магіле, як і ўсе тады, вельмі хацелі жыць. Наўрад ці многія думалі, што іх вядуць на расстрэл. Сталовыя прыборы, талеркі, манеты, папругі, боты, гузікі, грэбень — усё, што засталося ад гэтых бязвінна забітых людзей. Захаваліся і кулі — вялікія, пакрытыя ржой, — якія абарвалі жыцці тысяч чалавек... Гэтыя жудасныя знаходкі, якія, несумненна, пацвярджаюць факт генацыду ў дачыненні да насельніцтва нашай краіны, супрацоўнікі пракуратуры далучаць да матэрыялаў крымінальнай справы.

У расследаванні непасрэдны ўдзел прымаюць прадстаўнікі абароннага ведамства. 52-і асобны спецыялізаваны пошукавы батальён — унікальнае воінскае падраздзяленне, якое ўжо на працягу 26 гадоў уносіць каштоўны ўклад у захаванне памяці. Больш ніхто, акрамя гэтых вайскоўцаў, у нашай краіне не мае права займацца пошукавай дзейнасцю.

— Толькі за апошнія пяць гадоў ваеннаслужачыя батальёна адпрацавалі больш чым на 500 аб'ектах, дзе былі знойдзены астанкі 13 781 чалавека, — паведаміў **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.** — Усе яны перапахаваны з воінскімі ўшанаваннямі. Устаноўлена 680 імёнаў тых, хто знік без вестак. Наша задача — захаваць памяць аб мужнасці і гераізме няскоранага народа, аб тых жудасных злачынствах, якія адбываліся на нашай зямлі. Сёння скажэнне гістарычных фактаў стала, па сутнасці, зброяй супраць нашай краіны.

Работы каля ўрочышча Уручча вайскоўцам хопіць і на наступныя пошукавыя сезоны. Раскопкі будуць працягвацца да таго часу, пакуль не выявяць усе абставіны таго, што тут адбывалася ў гады вайны.

— Атрыманы дадатковыя даныя аб тым, што ў знішчэнні, асабліва мірнага насельніцтва, прымалі ўдзел, акрамя рэгулярных войскаў Вермахта і СС, шматлікія калабарацыяніцкія фарміраванні, якія складаюцца з нацыяналістаў Латвіі, Літвы, вайскоўцаў так званай Арміі Краёвай, украінскіх нацыяналістаў, — заявіў **намеснік генеральнага пракурора Аляксей СТУК.** — Рэгулярныя войскі даручалі знішчэнне мірнага насельніцтва і ўдзел у карных аперацыях менавіта гэтым фарміраванням. На жаль, такі настрой перадаўся і сучасным палітычным элітам гэтых краін. Нам часам адмаўляюць у аказанні прававой дапамогі па гэтай крымінальнай справе, у выдачы пэўных асоб. Гэта зрабілі ўжо Літва і Латвія.

У той жа час актыўна дапамагае ў расследаванні Расійская Федэрацыя: перадаюцца архіўныя дакументы, іншыя даныя, ажыццяўляецца прававая дапамога. Задача спецыялістаў — устанавіць усе факты злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў і іх памагатых на тэрыторыі Беларусі, а таксама знайсці адказных за іх здзяйсненне.

Расследаванне крымінальнай справы атрымала водгук у насельніцтва. Людзі паведамляюць у праваахоўныя органы аб падзеях, сведкамі якіх былі. Дзеляцца інфармацыяй і тыя, хто ведае аб злачынствах акупантаў са слоў відавочцаў.

Адзін з іх — Васіль Чарноў, які ўказаў на прыблізнае знаходжанне пахавання, дзе цяпер вядуцца раскопкі. Больш чым 20 гадоў таму ён даведаўся аб гэтай страшнай трагедыі, якая адбывалася каля Мінска, ад выпадковага чалавека. Гэта быў сведка аднаго з расстрэлаў. Разам з маці і малодшым братам яны вярталіся з лесу дамоў, як раптам пачулі выстралы, крыкі. Схаваліся пад арэшыну і прасядзелі там, пакуль не сцямнела. Раніцай дзецям стала цікава, што ж напярэдадні адбылося ў лесе. Вярнуліся і ўбачылі засыпаную пяском яму. Зямля яшчэ рухалася...

Да расследавання далучыліся шматлікія дзяржавы, свае намаганні дзеля ўстанаўлення справядлівасці аб'ядналі сілавыя структуры нашай краіны, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз. У архівах плённа працуюць гісторыкі. На ініцыятыву Генеральнай пракуратуры адрэагавалі і дэпутаты. У парламенце распрацоўваецца законапраект аб прызнанні генацыду беларускага народа.

— Мы сёння адказныя за тое, каб было ўстаноўлена, у тым ліку і на заканадаўчым узроўні, што ў адносінах беларускага народа, жыхароў іншых нацыянальнасцяў, якія жылі на тэрыторыі БССР, адбываўся генацыд, — заўважыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Лілія АНАНІЧ.** — Не можам сёння мы, беларусы, дапускаць таго, каб гістарычная памяць скажалася і каб нават у думках у кагосьці было адмаўляць гэты злавесны факт. Мы сёння павінны рабіць гэтыя правільныя крокі і даказваць на ўсіх узроўнях, на ўсіх пляцоўках сваё права захоўваць гістарычную памяць.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

IdeaBank
Отличная идея!

Наименование банка: **ЗАО «Идея Банк»**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2021 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 октября 2021 | На 1 января 2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 13 735 | 52 563 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 15 552 | 47 528 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 9 021 | 8 627 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 143 034 | 293 319 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | 5 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 23 719 | 24 797 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 4 374 | 5 821 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | 830 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | 12 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 6 063 | 8 607 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 215 498 | 442 109 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 38 606 | 1 528 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 88 389 | 334 912 |
| 20 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | 16 852 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 630 | 2 211 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 128 625 | 355 503 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 47 187 | 40 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 12 583 | 12 583 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 7 828 | 8 819 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 19 275 | 25 204 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 86 873 | 86 606 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 215 498 | 442 109 |

## ОТЧЕТ
### о прибылях и убытках
на 1 октября 2021 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 1 июля 2021 | На 1 июля 2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 23 974 | 35 446 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 13 737 | 20 264 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 237 | 15 182 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 7 469 | 10 284 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 5 448 | 6 436 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 021 | 3 848 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 117 | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 810 | 13 933 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (1 761) | 5 280 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4 042 | 3 748 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 23 696 | 25 731 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 673 | 2 364 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 619 | 3 336 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 352 | 1 325 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 267 | 2 011 |

И.о. Председателя Правления А.А. Грицель

Заместитель главного бухгалтера А.В. Азаревич

22 октября 2021 года

УНП 807000122

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» информирует о проведении 11.11.2021 аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевхимволокно»

Лот № 1: капитальное строение с инв. № 700/С-49719 – овощная база, площадь – 1324,0 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: одноэтажное каменное здание овощной базы (инв. №№ по бух. учету: 1000009800, 1000078800, 1000078900, 1000079000). Адрес: г. Могилев, пр-т Шмидта, 45. Капитальное строение с инв. № 700/С-105889 – асфальтобетонное покрытие, площадь – 1996,5 кв. м, адрес: г. Могилев, пр-т Шмидта, территория ОАО «Могилевхимволокно». Забор металлический, инв. № 2030069500. Капитальное строение с инв. № 700/С-112112 – канализационная сеть от магистрали к зданию 731 (овощехранилище), протяженность 70,8 м. Адрес: г. Могилев, пр-т Шмидта, в районе здания 45/8. Сведения о земельных участках: кадастровый № 740100000005005537 (площадь 0,4810 га, право аренды), кадастровый № 740100000005005600 (присвоен предварительно). Условие аукциона: покупатель несет обязательства по передаче электроэнергии для электроснабжения объектов ОАО «Могилеавхимволокно» до момента ввода в эксплуатацию проекта «Возведение комплектной трансформаторной подстанции» с организацией сети электроснабжения по проспекту Шмидта, 45 в г. Могилеве». Начальная цена продажи: 180 617,48 бел. руб. с учетос НДС.

**Аукцион состоится 11 ноября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Доп. информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56 и на сайте ino.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания магазина № 84 с инв. № 620/С-43046 общ. пл. 88,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622283006601000020 площадью 0,1895 га, по адресу: Минская область, Дзержинский район, Путчинский с/с, д. Липки, ул. Дружная, 3.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья № 76, площадь 0,1895 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадь – 0,0054 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 8 880,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **888,00 бел. руб.**).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2021.

Аукцион состоится **10.11.2021 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.11.2021 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. **Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801716) 649-33, (8029) 578-35-46.**

УНП 600037767

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ КОНФИСКОВАННОГО ИМУЩЕСТВА 23 НОЯБРЯ 2021 ГОДА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1*** Капитальное строение, инв. № 400/С-124583. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство. Площадь 8176,1 кв. м. Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, благоустройство | | | |
| **Начальная цена** | **668 880,00 руб.** | *Сумма задатка* | *66 000,00 руб.* |
| **Лот № 2*** Капитальное строение, инв. № 400/С-124561. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – ограждение. Площадь – 565,2 кв. м. Адрес (местоположение): г. Гродно, ш. Скидельское, 8, ограждение | | | |
| **Начальная цена** | **5 630,40 руб.** | *Сумма задатка* | *563,00 руб.* |
| **Лот № 3*** Капитальное строение, инв. № 400/С-86574. Назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **ограждение территории**. Капитальное строение инв. № 400/С-49769. Назначение – материальный склад, наименование – **материальный склад**. Площадь – 982,7 кв. м. г. Гродно, ул. Индустриальная, 5 | | | |
| **Начальная цена** | **166 536,00 руб.** | *Сумма задатка* | *16 000,00 руб.* |
| **Лот № 4*** Земельный участок с кадастровым номером 422084000019000028. Общая площадь 0,0800 га. Целевое назначение – земельный участок для коллективного садоводства. Адрес (местоположение): Гродненская область, Гродненский район, Квасовский сельсовет, СТ «Гарант», д. 348 | | | |
| **Начальная цена** | **2 544,00 руб.** | *Сумма задатка* | *250,00 руб.* |

* - Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган, и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

**Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Аукцион состоится 23 ноября 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 25 октября по 17 ноября 2021 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056 Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу http://gki.gov.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н.М., извещает о проведении 9 ноября 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 часов в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-181**, общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Изолированное помещение с инв. №311/D-8627**, общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-9721**, общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Капитальное строение с инв. № 311/С-30617**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619**, общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034** общей площадью **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **63 037,60** | 3 151,88 | 6 303,76 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8(044)769-19-61, 8 (0232)53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)**. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 26 октября 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 5 ноября 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст.127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 12.02.2021 г. № 27 (29396). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8(029) 651-22-19, 8(029) 126-66-62.**

# МАЮ ЖАДАННЕ, АЛЕ НЕ МАЮ МАГЧЫМАСЦІ...

## Сексолаг пра далікатную мужчынскую праблему і ролю жанчыны

**Ужо даўно выкрыты міфы, што праблемы з патэнцыяй бываюць толькі ў мужчын старэйшага ўзросту. Сёння ўрачы ўсё часцей бачаць на прыёме маладых пацыентаў. Па даных Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, на эрэктыльныя парушэнні скардзіцца кожны дзясяты мужчына ва ўзросце 21—29 гадоў, у 30—35 гадоў — кожны пяты, у 40—70 гадоў — амаль кожны другі. Такія маштабы на сёння, а па прагнозах экспертаў у найбліжэйшыя 25 гадоў гэтыя лічбы могуць падвоіцца. Пра тое, з чым звязаны гэтыя праблемы, асабліва ў маладых мужчын, і наколькі важна з імі спраўляцца своечасова, «Звяздзе» расказаў сексолаг Максім ПАДАЛЯК.**



***— Максім Віктаравіч, што такое эрэктыльная дысфункцыя? Як яна сябе праяўляе?***

— Гэта збіральны тэрмін, і калі расшыфроўваць яго літаральна, гэта парушэнне функцыі ў выглядзе страты ці зніжэння эрэкцыі. Раней гэта называлася зніжэннем патэнцыі ці імпатэнцыяй, яшчэ называюць палавым бяссіллем. Можа праяўляцца як да пачатку палавога акта, калі мужчына ў цэлым не можа яго завяршыць, так і падчас, калі ў мужчыны змяншаецца эрэкцыя. Або гэта можа быць няпоўнае напружанне палавога члена, з-за чаго палавы акт ускладнены ці становіцца немагчымым.

***— У якім узросце гэта здараецца?***

— Ёсць фізіялагічнае праяўленне дысфункцыі ў мужчын, калі з-за ўзросту зніжаецца ўзровень гармонаў, якія рэгулюе палавое жаданне, адпаведна зніжаецца палавая актыўнасць. У некаторых гэта наступае толькі пасля 70, у кагосьці — пасля 50, тут усё індывідуальна. Шмат выпадкаў, калі мужчына захоўвае сваю функцыю на працягу ўсяго жыцця.

Аднак сярод нашых пацыентаў нямала і маладых фізічна здаровых мужчын 20—30 гадоў. Род іх заняткаў цяпер распаўсюджаны — работа за камп'ютарам. З аднаго боку, гэта сядзячы лад жыцця, з-за чаго парушаецца кровазварот органаў таза, у тым ліку і палавых. З іншага — гэта трывогі, страхі, стрэсы, характэрныя для маладых людзей, якія імкнуцца да поспеху і заробку грошай, шмат часу надаюць рабоце. У іх такія праблемы ўзнікаюць часта. Тут асноўная прычына — не ўзрост і нават не наяўнасць саматычных хвароб. Хоць і яны адыгрываюць немалую ролю: цукровы дыябет, розныя сардэчна-сасудзістыя хваробы, гарманальныя парушэнні таксама прыводзяць да зніжэння патэнцыі. Аднак у дадзеным выпадку на першы план выходзяць псіхалагічныя праблемы. Гэтыя маладыя людзі па сваіх асабовых якасцях дастаткова трывожныя і надумлівыя. І, аднойчы звёдаўшы няўдачу ў інтымных адносінах, яны на ёй фіксуюцца.

Уплываюць і розныя фільмы для дарослых, дзе мужчыны добра праяўляюць свае магчымасці, але ніхто не ўлічвае, што часцей за ўсё акцёры прымаюць спецыяльныя прэпараты. І ў галаве ёсць пэўны ідэал, такі малады чалавек адчувае сябе моцным і энергічным, ускладае на сябе шмат спадзяванняў, ідэалізуе сваю сексуальнасць, а на справе так не атрымліваецца. Гэта выклікае ў яго трывогу, бо трывожна-надумлівыя асобы баяцца ацэнкі з боку жанчыны. І вельмі на гэтым зацыкліваюцца. Кожны раз гэтыя перажыванні дублююцца, і такія мужчыны дастаткова часта адчуваюць палавое бяссілле. У выніку звяртаюцца па дапамогу. Прыходзіць у такім выпадку трэба да сексолага — спецыяліста, які працуе з псіхалагічным фактарам.

***— Якую ролю ў гэтым адыгрывае партнёрша? Ці можа жанчына быць прычынай палавога бяссілля?***

— Жанчына — не, прычынай могуць быць адносіны мужчыны і жанчыны. Канфлікты і нежаданне жанчыны інтымных адносін або прыніжэнне мужчынскай годнасці ўзмоцняць праблему. Тут патрэбны добрыя, роўныя адносіны, пабудаваныя на ўзаемаразуменні і даверы, а сёння гэта не так часта сустракаецца. Інтым у пары з'яўляецца, калі яшчэ не выбудаваны даверлівыя адносіны, як правіла, праз некалькі тыдняў ці месяцаў. Я ўжо не кажу пра выпадковыя сувязі, якія часта здараюцца пад уплывам алкагольнага ап'янення, калі мужчына адчувае сябе разняволеным, лягчэй выбудоўвае камунікацыю, адчувае энергію, але пры гэтым палавая здольнасць з-за алкаголю зніжаецца.

Жанчына можа садзейнічаць паляпшэнню палавога жыцця мужчыны, нават проста праявіўшы разуменне. Бо, як я адзначаў, у мужчыны гэта можа адбывацца з-за стрэсаў, якія ён адчувае на рабоце. Часам я рэкамендую пацыентам паспрабаваць спачатку наладзіць адчувальны кантакт без абавязацельстваў працягу: абдымкі, пацалункі, дакрананні, што знімае трывогі і напружанне, чалавек фіксуецца на адчуваннях. Гэта напалову вырашае праблему, калі для мужчыны не стаіць задача абавязкова паказаць сябе малайцом. На такім узроўні таксама ўзнікаюць розныя прыемныя адчуванні, пры гэтым мужчына расслабляецца, і яго функцыя аднаўляецца. І ён будзе больш разняволена адчуваць сябе падчас палавога акта.

***— А калі гэта не дапаможа?***

— Ёсць два найбольш распаўсюджаныя метады лячэння псіхалагічных праблем — медыкаментозны і псіхатэрапеўтычны. Медыкаментозны дазваляе зняць трывогі і страхі. І на гэтым фоне ў мужчыны можа аднавіцца функцыя. А для замацавання выніку праводзіцца псіхатэрапія, каб чалавек усвядоміў прычыны сваіх трывог, прапрацаваў іх, трансфармаваў і выпрацаваў больш пазітыўныя ўстаноўкі, каб такая сітуацыя ў будучыні не паўтаралася ці не выклікала трывог, нават калі ён адчувае зніжэнне эрэктыльнай функцыі.

У прынцыпе для мужчыны нармальна, калі пасля 30 гадоў эрэкцыя зніжаецца. У адным рэжыме яна захоўваецца толькі ў падлеткаў пры іх гіперсексуальнасці. У мужчын больш старэйшага ўзросту, безумоўна, будзе зніжэнне, і з-за сваёй трывожнасці некаторыя бурна на гэта рэагуюць. Таму псіхатэрапія накіравана на тое, каб змяніць стаўленне да гэтай праблемы.

***— Жыццё ў стрэсе, здаецца, адмыслова культывуецца некаторымі работадаўцамі...***

— Трывожныя, надумлівыя людзі найбольш выгадныя ў сучаснай эканоміцы. У заходніх краінах нездарма вельмі папулярная групавая псіхатэрапія, у кожнага ёсць свой асабісты псіхатэрапеўт. Менеджары сярэдняга звяна ці кіруючы састаў адмыслова набіраюць такіх людзей: адказных, здольных за ўсё перажываць, засяроджаных на поспеху, у тым ліку фінансавым. Гэта такі склад асобы, аднак ён распаўсюджваецца не толькі на работу, але і на іншыя сферы жыцця. Сярод маладых людзей сучаснага пакалення гэта вельмі частая з'ява.

***— Калі мы ўжо закранулі медыкаментознае лячэнне, то што вы думаеце наконт такіх прэпаратаў, як «Віягра»? Ці варта імі карыстацца?***

— У аптэчнай сетцы шмат яе аналагаў. Прычым часта мужчыны не звязваюць тыя прэпараты, якія прымаюць, з ёй, хоць гэта, па сутнасці, тое ж самае, маўляў, я яшчэ не настолькі дрэнны, каб яе прымаць. Асноўнае паказанне для прыёму гэтых прэпаратаў — пагаршэнне патэнцыі, звязанае з парушэннем кровазвароту. Таму прымяняюцца яны дастаткова шырока, але не заўсёды апраўдана, прычым не столькі з-за негатыўных пабочных эфектаў, колькі псіхалагічных.

Такі прэпарат, нават калі мужчына нічым не хварэе, паляпшае патэнцыю. І ўзнікае псіхалагічная сувязь, што толькі гэтыя таблеткі дапамагаюць. І мужчына пачынае іх прымаць пастаянна. На самай справе ў яго арганізме няма такіх парушэнняў, якія б патрабавалі прыёму прэпаратаў. Хутчэй яны дзейнічаюць як плацэба: мужчына адчувае трывогу і здымае яе таблеткай. І працягвае прымаць на працягу жыцця, пакуль праблема не становіцца істотнай і прэпарат не перастае дзейнічаць з-за з'яўлення іншых хвароб ці з-за таго, што трывога ўзяла верх. Насамрэч прэпарат і не патрэбен быў — дастаткова было ліквідаваць трывожны фактар.

***— Колькі часу патрэбна, каб пазбавіцца трывогі?***

— Медыкаментознае лячэнне пры дапамозе антыдэпрэсантаў доўжыцца ў сярэднім месяц-два. На псіхатэрапію людзі рэагуюць па-рознаму. Некаторыя маладыя людзі адразу кажуць, што скептычна да яе ставяцца. Часта з псіхалагічных методык на тэлеканалах робяць шоу, што, канешне, зніжае давер. Безумоўна, важная матывацыя — наколькі чалавек настроены выконваць рэкамендацыі ўрача. Часта прыходзяць маладыя людзі, якія хочуць, каб праблема вырашалася імгненна чароўнай таблеткай. Урач дае рэкамендацыі, праз тыдзень пацыент кажа «не дзейнічае» і бяжыць да іншага ўрача. Той прызначае сваё лячэнне, праз тыдзень яно зноў «не працуе», і пацыент аказваецца ў трэцяга доктара, і так па крузе. Таму важна разумець: калі хочаце атрымаць вынік, трэба набрацца цярпення. Праблема нарадзілася не ўчора, і справіцца з ёй за кароткі час не атрымаецца. Для адных патрэбен месяц, для іншых — некалькі месяцаў.

***— Ці могуць быць праблемы з інтымнымі адносінамі ў жанчын?***

— Адна з іх — зніжэнне палавога жадання пасля родаў, вельмі распаўсюджаная з'ява. Мы прызвычаіліся ставіцца да сексу як да псіхалагічнага феномену. І забываем, што гэта адна з нашых асноўных біялагічных функцый. Чалавек так устроены, што ён мусіць пакінуць патомства. Прычым гэта датычыцца не толькі чалавека, але і іншых жывых істот. Гэта функцыя выпрацавана эвалюцыйна і ўшыта ў арганізм чалавека. І таму мужчына пры ўзнікненні праблем у палавым жыцці так рэагуе, бо адчувае сваю нікчэмнасць, і гэта яго моцна бянтэжыць.

Для жанчыны задача крыху іншая — нарадзіць і вырасціць дзяцей. Нельга, канешне, сказаць, што толькі жанчына іх гадуе, але тое, што жанчына корміць дзіця, — адна з яе асноўных задач. Што адбываецца падчас нараджэння і груднога кармлення? Для прыроды жанчына на гэты час мусіць быць выключана з палавога працэсу. І як дзейнічае арганізм у гэтай сітуацыі? Ёсць гармон пралактын, які вылучаецца гіпофізам. Пасля родаў колькасць яго павышаецца, ён стымулюе выдзяленне груднога малака. Пры гэтым зніжаецца выпрацоўка тэстастэрону, які з'яўляецца асноўным рэгулятарам палавога жадання — яно, адпаведна, зніжаецца.

***— Што ў такім выпадку рабіць і ці трэба нешта рабіць?***

— У ідэале не трэба. Важна спакойна выканаць сваё прызначэнне, пасля груднога кармлення скончыцца, знізіцца пралактын, і павысіцца тэстастэрон, адновіцца палавое жаданне. Але жанчына жыве з партнёрам, у якога няма такіх праблем. І ён не вельмі разумее, што адбываецца, і хоча працягу інтымных адносін — каб усё было як і раней. Часам жанчына і сама з-за гэтага сумуе: здаецца, што ўсё страчана, бо яна перастае адчуваць палавое жаданне і атрымліваць задавальненне. З іншага боку, страшна, што мужчына згубіць да яе цікавасць, бо яна не рэагуе на яго сексуальную прадпрымальнасць. Што рабіць у такім выпадку? Найперш рэкамендуецца не ўступаць у інтымныя адносіны месяц-два пасля родаў, як раяць урачы-гінеколагі. На такі выпадак ёсць рэкамендацыі пазбягаць палавога акта з пранікненнем, замяняць яго іншымі формамі.

Пасля гэтага тэрміну, нягледзячы на тое, што ў жанчыны недастаткова палавога жадання, некаторыя аднаўляюць інтымнае жыццё, каб падтрымаць партнёрскія адносіны і не даць мужу збегчы. На мой погляд, гэта не зусім правільна, і ў нас гэта адбываецца з-за недахопу інфармаванасці і ўзаемаразумення. Як бы там ні было, для інтымных адносінаў пасля родаў жанчына павінна быць падрыхтаваная — напрыклад, прымяняць лубрыканты, інакш палавы акт будзе балючы. Для жанчыны гэта даволі траўматычна, узмацняе трывогу і страх. Каб папярэдзіць такія сітуацыі, патрабуецца больш доўгая прэлюдыя, мужчына павінен удзяляць больш увагі, праяўляць сваю дабрыню, разуменне і цярплівасць. Можна выкарыстоўваць лубрыканты, мяняць позы — тут мужчына павінен іграць на карысць жанчыны.

***— Ці можа зніжацца палавое жаданне ў жанчын з узростам?***

— Як вядома, жанчына перажывае клімакс. Ён суправаджаецца змяненнем гарманальнага фону, палавое жаданне можа таксама знізіцца, але функцыя ў жанчыны ўсё роўна не знікае. Можа зніжацца эластычнасць палавых органаў і ўвільгатненне, але для гэтага таксама існуюць дапаможныя сродкі. Калі жанчына не хоча інтымных адносін, тут важна дамовіцца з партнёрам. У адваротным выпадку гэта будзе выглядаць як гвалт: кожны раз жанчына будзе ісці на ўступкі і перажываць непрыемныя адчуванні. Тут таксама важны ўзровень даверу і ўзаемаразумення паміж мужам і жонкай і ўменне дамаўляцца.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Каранавірус можа выклікаць эрэктыльную дысфункцыю

**Пасля перанесенага COVID-19 рызыка эрэктыльнай дысфункцыі можа павялічвацца ў 5,6 раза, паведамляе расійскі тэлеканал РБК.**

Гэта праблема можа датычыцца як людзей старэйшага ўзросту, так і маладых. Урологі кажуць, што дакладна сцвярджаць наконт пагаршэння патэнцыі пакуль нельга, аднак тое, што каранавірусная інфекцыя абвастрае ў мужчын хранічныя хваробы, у прыватнасці хранічны прастатыт, — факт. А на фоне яго абвастрэння зніжаецца лібіда.

Эксперты сцвярджаюць, што на патэнцыю ўплываюць розныя фактары: ад стрэсу да агульнага стану арганізма і самаадчування. Каранавірусная інфекцыя — вельмі цяжкая хвароба. А сексуальная функцыя ў мужчын можа быць рэалізавана толькі пры поўным здароўі. Гэта ж не дыхальная ці стрававальная функцыі, якія неабходны для выжывання, і яна працуе, калі ў парадку ўсё астатняе.

У маі вучоныя з Маямі высветлілі, што каранавірус захоўваецца ў тканках мужчынскага палавога органа доўгі час. Дзіўнага тут нічога няма, бо гэты вірус знаходзілі ў розных частках цела тых, хто перанёс COVID-19. У тых, хто раней перахварэў, была дысфункцыя эндатэлію, які рэгулюе тонус сасудаў. Каранавірус выклікае запаленне эндатэлію — тканкі, якая высцілае крывяныя і лімфатычныя сасуды. Запаленне можа выклікаць закупорку крывяносных сасудаў, што прыводзіць да зніжэння прытоку крыві да палавога органа, а як вынік — эрэктыльная дысфункцыя.

Між тым расійскія вучоныя лічаць, што для пацвярджэння залежнасці ад COVID-19 эрэктыльнай дысфункцыі неабходна правесці больш маштабныя даследаванні.

# «Іж ён мне айцу свайму жаласці і прыкрасці вялікія чыніў»

## Гісторыі няўдалых спадчыннікаў

**Усім вядомая прымаўка, што яблык ад яблыні далёка не коціцца... Але далёка не заўсёды ў гісторыі спраўджваецца, што якая хатка, такі і тын, які бацька, такі і сын. І нярэдка ў гісторыі яблыкі так далёка адкочваліся ад яблыні, што здаецца, быццам упалі з іншага дрэва... Пасля смерці мецэнатаў закрываліся навучальныя ўстановы, іншым канфесіям перадаваліся храмы, прадаваліся і прайграваліся ў карты палацы... А што датычыцца архіваў, тут увогуле на Беларусі бяда! Здаралася, калі спадчыннік, знаходзячы творы на «мужыцкай гаворцы», адмыслова іх нішчыў, каб не псаваць рэпутацыю продка. Паперы Францішка Багушэвіча перад вобыскам былі схаваныя ў слоік, закапаныя на агародзе — і цалкам сатлелі. Яшчэ фалькларыст Міхал Федароўскі наракаў, што «злачынцы-ўнукі не пераняалі ад сваіх дзядоў іх паважлівага стаўлення да старажытных дакументаў».**
**Давайце ж успомнім некаторыя гісторыі пра няўдалых спадчыннікаў.**

### ІЛЬІНІЧЫ: ЗГАСАННЕ З-ЗА СКВАПНАСЦІ

Самы вядомы з Ільінічаў, Юрый, быў чалавекам надзвычай амбітным. Збіраў пасады — ён і намеснік лідскі, і намеснік ковенскі, і намеснік берасцейскі, і да таго ж маршалак дворны. І для ўмацавання роду пачаў узводзіць Мірскі замак. Магутны, не горшы за каралеўскія, з пяцццю вежамі, якія сімвалізуюць яго і чатырох сыноў. Усе свае сродкі ўкладаў у будаўніцтва, яшчэ і запазычыўся... Кажуць, нават прыўлашчыў «10 тысяч залатых вугорскіх чырвоных» памерлага падскарбія Аўрама Езафовіча Рабічковіча.

Вядома, Юрый марыў, як нашчадкі працягнуць яго справу, уладары Мірскага замка стануць паважанымі і ўплывовымі... Вось толькі чацвёра сыноў так сапсавалі адносіны з бацькам, выявілі сябе гулякамі, гульцамі і буяшамі, што ён у запавеце забараніў ім уступаць у валоданне спадчынай, пакуль не расплоцяцца з даўгамі. Старэйшага ўвогуле пазбавіў спадчыны, «иж он мне отцю своему жалости и прикрости великие чинил». Варта было памерці Юрыю, сыны ўзяліся біцца за спадчыну. Мікалай Ільініч, які ў летапісы ўвайшоў як страшэнны марнатраўца, не дачакаўся канца дзяльбы, памёр. Станіслаў, які ўступіў у валоданне Мірскім замкам, быў праз чатыры гады атручаны падчас банкету. Яго брат Фелікс Шчасны, якому дастаўся замак, знайшоў віноватага — атручвальніцу-прыслугу, якую і спалілі на вогнішчы як вядзьмарку... Сустракала звесткі, што старэйшы брат Іван, абдзелены спадчынай, тады дамогся права на яе частку... За ўсімі разборкамі браты забыліся... пахаваць бацьку. Давялося ўмяшацца каралю, каб Юрыя нарэшце годна пахавалі.

І што атрымалася ў выніку? Сын Фелікса Шчаснага Юрый, хоць і атрымаў графскі тытул з-за таго, што валодаў замкам, памёр бяздзетным, замак адпісаў свайму апекуну, Радзівілу Сіротку. Род згас.



### АСТРОЖСКІЯ: РАЗЛАД З-ЗА ВЕРАВЫЗНАННЯ

Колькі паспеў стварыць за сваё жыццё Канстанцін Астрожскі, сын знакамітага ваеннага дзеяча Канстанціна Астрожскага, цяжка асэнсаваць. Канстанцін, унук беларускай амазонкі Анастасіі Слуцкай, абараняў ідэю незалежнасці беларускіх і ўкраінскіх земляў, права іх жыхароў на захаванне сваёй веры. Стварыў ва ўкраінскім уладанні праваслаўную Астрожскую акадэмію і друкарню пры ёй. Там шчыравалі Мялецій Смятрыцкі, Стэфан Зізаній, Андрэй Рымша, Лявонцій Карповіч, Пятро Мсціславец і Іван Фёдараў. У Астрогу выдаваліся школьныя падручнікі, а яшчэ ў 1581 годзе была надрукаваная першая ва Усходняй Еўропе поўная Біблія. Будаваў праваслаўныя храмы і кляштары, арганізоўваў супраць уніі Брэсцкі памесны сабор, з-за чаго пасварыўся з каралём Жыгімонтам. Пражыў доўга, да васьмідзесяці гадоў, памёр у Тураве, пахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры, сёння кананізаваны. Пры гэтым рэлігійным фанатыкам не быў. Жонка яго, Соф'я Тарноўская, каталічка. Але, безумоўна, князь, пакідаючы спадчыннікам велізарныя багацці — кажуць, пры жыцці яго маёмасць была ў тры разы большай за маёмасць караля, — спадзяваўся, што яны працягнуць яго справу. Але два сыны сталі каталікамі. Малодшы сын Аляксандр, які захоўваў веру бацькі, быў атручаны слугою ў трыццаць два гады. А дачка Аляксандра, Ганна-Алаіза, вырасла зацятай каталічкаю. Калі ў Астрозе быў заснаваны езуіцкі калегіум, Ганна-Алаіза перастала фінансаваць Астрожскую акадэмію. А ў 1636 годзе канчаткова яе закрыла. І нават запрасіла ксяндза, каб правёў каталіцкі абрад хрышчэння над астанкамі яе бацькі, кажуць, уласнаручна абмыла яго косці ў святой вадзе.

### ЦЯПІНСКІЯ: РАЗЛАД З-ЗА КЕПСКІХ ХАРАКТАРАЎ

«Народу майму раблю паслугу з убогае сваёй маёмасці, на якой і пры якой (жыву) у маёнтку. Хоць ён ужо і не надта вялікі з-за выдаткаў, і асабліва (выдаткаў) на здабыванне ў розных і няблізкіх месцах старадаўніх кніг. Акрамя таго, яшчэ ў мінулыя гады перадольваў я цяжкія дарогі з-за друку і спадарожных яму патрэб, і, амаль усё пачынаючы зноў, ува многім і дагэтуль так працягваецца, бо я не італьянец, не немец, не доктар або які-небудзь (чалавек) з асяроддзя паноў», — пісаў беларускі асветнік Васіль Цяпінскі ў прадмове да выдрукаванай ім ва ўласнай друкарні кнігі — Евангелля. А яшчэ заклікаў, каб навучанне ў школах вялося не на польскай ці лацінскай, а на роднай мове беларусаў, выказваўся наконт выхавання дзетак...

А вось з уласнымі не ўсё атрымалася гладка.

Увогуле, сямейка была гарачая. Хоць звесткі фрагментарныя, часта пераблытаныя. Але высветлена, што ў Васіля Цяпінскага быў стрыечны брат — цёзка Васіль і варагавалі яны так, што сыны аднаго з іх забілі свайго дзядзьку Васіля. Даследчыкі мяркуюць, што забіты быў менавіта асветнік. Потым забойцы напалі на сыноў забітага, калі тыя ехалі ў Полацк у гродскі суд. Дарэчы, і бацькі абодвух Васілёў, родныя браты Мацей і Мікалай, варагавалі, засталіся дакументы, што яны судзіліся «за абразу». І сыны забітага Васіля Цяпінскага, Абрам і Табіяш, ніяк не маглі падзяліць маёнтак Цяпіна. Табіяш выгнаў брата з маёнтка. Дамовіліся, што выплаціць грашовую кампенсацыю — не выплаціў. Абрам падаў у суд. Калі ў Цяпіна прыехаў суддзя Баўтрамей Банкоўскі аднавіць справядлівасць, Табіяш яго выгнаў таксама. Быў асуджаны на баніцыю — выгнанне, але нікуды не паехаў. Зразумела, гаворкі пра тое, каб працягнуць асветніцкую справу бацькі, нават не ішло.






### ПУСЛОЎСКІЯ: СТРАТЫ З-ЗА ЛЮДАМАНІІ

Валоданне замкам альбо шыкоўным палацам — гэта не толькі раскоша... Але і права на атрыманне тытула. Прынамсі, Пуслоўскія, якія займелі Косаўскі палац, настойліва дамагаліся графскага звання. Трэба ж узнагародзіць сябе за высілкі! Войцех Пуслоўскі, якому дасталася Косава ад Флемінгаў, будаваў дарогі, шматлікія мануфактуры, вінакурні, млыны... Сын яго, Вандалін, быў гэткі ж прадпрымальны: дзякуючы яму з'явілася на Палессі першая фабрыка з паравым рухавіком. І палац пры ім разбудаваўся неверагодна, гаспадар нават запрасіў з Варшавы вядомага архітэктара Францішка Яшчальда. Палац мусіў быць у рыцарскім стылі. Дванаццаць вежаў па колькасці месяцаў, шкляная падлога, пад якой плавалі рыбы — відаць, па ўзоры Нясвіжскага палаца Пане Каханку. І нават, падобна Пане Каханку, Вандалін соллю ўлетку дарогу пасыпаў, каб жонка Ядвіга магла на санях праехацца.

А вось сын Вандаліна, Леанард, які ўспадчынніў палац, хоць і быў, кажуць, «непераўзыдзеным публіцыстам», то-бок, язык добра падвешаны, меў загану, якая згубіла не адзін арыстакратычны род. А менавіта быў людаманам — зацятым гульцом. Ну і выпівохам таксама лічыўся хвацкім. Вядомы цэлы шэраг судовых працэсаў з прычыны фінансавых спрэчак паміж ім і вядомым калекцыянерам Ігнацыем Корвін-Мілеўскім. Маёмасць, набытая Вандалінам, патроху растрачвалася. Урэшце дайшла чарга і да Косаўскага палаца. Па адных звестках, палац выставіў на продаж яшчэ Вандалін, каб расплаціцца з даўгамі. Па другіх — Леон прайграў Косава ў карты, па трэціх — «сарваўся ў Монтэ-Карла», то-бок, прайграўся ў казіно і прадаў Косава за 700 тысяч рублёў расійскаму князю Аляксандраву.

Леон памёр у 1894 годзе ва ўзросце 42 гадоў. Косаўскі палац пераходзіў з рук у рукі і занепадаў.



### ПЕСЛЯКІ: ПАРУШЭННЕ ЗАПАВЕТУ З-ЗА ЦЫНІЗМУ

Усім вядома беларуская святыня — абраз Маці Божай Барунскай. Ён належаў ігумену базыльянскага полацкага кляштара Ісафату Бражыцу, а той падарыў абраз свяяку, пабожнаму шляхціцу Мікалаю Песляку. Пясляк дзеля атрыманай святыні ў 1692 годзе заснаваў у сваіх уладаннях, у Барунах, базыльянскі кляштар і перадаў туды абраз. Паводле легенды, яму ў сне з'явілася сама Маці Божая, каб паказаць адпаведнае месца. Пясляк аддаў базыльянам ва ўтрыманне Баруны разам з жыхарамі, будынкамі ды зямлёю. У запавеце загадаў спадчыннікам пабудаваць замест узведзенага ім драўлянага каменны храм з вялікім алтаром, дзе праводзіць «рымскае і грэчаскае набажэнствы» са спевамі і музыкай.

Знайшла, аднак, звесткі, што ў 1702 годзе ў Літоўскім трыбунале разбіралася непрыемная справа, якая датычылася нашчадкаў Мікалая Песляка, Яна — яго старэйшага сына, а таксама Пятра, Васіля і Якава Песлякоў (не ведаю ступені сваяцтва, магчыма, малодшыя сыны). Ян Пясляк, згодна з запаветам бацькі, мусіў прыняць манаскі сан і завяршыць будаўніцтва каменнага храма.

Але быццам бы Песлякі грошы, сабраныя дзеля прыкрасы цудатворнага абраза (а ахвяравалі шмат), трацілі на свае п'янкі. Забіралі сабе ўвогуле ўсё, што мусіла аддавацца на ўзвядзенне каменнага храма, нават збівалі мніхаў, якія іх ушчувалі. У Баруны наведаўся мітрапаліт Леон Заленскі, але дарэмна. Урэшце п'янага Яна ўдалося ўзяць у ланцугі і адправіць на трыбунал. Нашчадкі пабожнага Мікалая Песляка абвінавачваліся ў тым, што нанеслі базыльянам урон у 300 тысяч злотых. Паводзіны Яна можна зразумець: Баруны, каб не воля бацькі, належалі б яму, а не базыльянскім мніхам. Не ведаю, наколькі гэтая гісторыя праўдзівая. У тым жа 1702 годзе, калі набліжалася шведскае войска, мніхі перадалі абраз на захаванне гетману Міхалу Вішнявецкаму ў Валожын. Але ў часы бескаралеўя ўсё магло здарыцца...

Суд пазбавіў Песлякоў права апякунства кляштара, але і спаганяць грошай з іх не сталі. У 1707-м каменны храм на месцы драўлянага быў узведзены. Руйнаваўся, аднаўляўся... Але цешыць вока і дасюль, і абраз Маці Божай Барунскай па-ранейшаму там, хоць знаўцы вядуць спрэчкі, арыгінал гэта ці копія...

Няхай жа добрыя справы бацькоў і дзядоў ніколі не рушацца з-за нядбайства нашчадкаў.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# Паланэзы ў Нясвіжы

## Мінчанка падарыла Радзівілаўскаму палацу ўнікальны раяль, які перажыў блакаду

**У экспазіцыі Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» з'явіўся антыкварны кабінетны раяль фабрыкі Rönisch.**



Як расказалі ў музеі-запаведніку, раяль з гісторыяй, шрубавае крэсла з круглым сядзеннем і VIII том (паланэзы) для фартэпіяна поўнага Збору твораў Фрэдэрыка Шапэна перадала ў дар **мінчанка Тамара Мікалаеўна АСТАПЕНКА** — піяністка, лаўрэатка міжнародных конкурсаў, уладальніца ганаровага дыплома Міжнароднага музычнага форуму «Мастацтва XXI стагоддзя» і дыплома Сусветнай Арганізацыі ЮНЕСКА.

Гэты інструмент у свой час належаў прадстаўнікам вядомай сям'і Бенуа, якая падарыла Санкт-Пецярбургу і Расіі вялікую колькасць дзеячаў мастацтваў — таленавітых мастакоў, архітэктараў, мастацтвазнаўцаў. Пазней раяль трапіў у дом бабулі Тамары Мікалаеўны. Вядома, што музычны інструмент перажыў блакаду Ленінграда ў Вялікую Айчынную вайну.

Раяль, падораны комплексу «Нясвіж», мяркуючы па серыйным нумары (40509), датуецца 1905—1906 гадамі. На інструменце прысутнічаюць Гербы Германіі, Саксоніі, Расійскай Імперыі, а таксама факсіміле подпісу Карла Рэніша з таўром і надпісам: «Сапраўдным подпісам у таўро засведчана, што для гэтага інструмента былі выкарыстаны самая старанная праца і бездакорны матэрыял».

Трэба сказаць, што ў вытворчасці інструментаў фабрыкі Rönisch заўсёды выкарыстоўваліся якасныя матэрыялы: натуральная драўніна ўнікальнага рэзананснага лесу, а таксама высокатрывалыя металадэталі, для аздаблення выкарыстоўваліся каштоўныя і рэдкія пароды дрэва.

Дарэчы, Сяргей Рахманінаў напісаў свой сусветна вядомы трэці канцэрт на раялі фірмы Rönisch. Яго раяль з серыйным нумарам 59183 прадстаўлены сёння ў музеі-сядзібе Рахманінава ў Расіі ў Іванаўцы (Тамбоўская вобласць). А ўбачыць яго нясвіжскага «родзіча» цяпер можна ў Камінный зале палацавага комплексу.

Як запэўніў **дырэктар Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» Дзмітрый ЯШЧАНКА**, унікальны музычны інструмент стане не толькі візуальным музейным экспанатам, але і будзе дарыць асалоду прыхільнікам класічнай музыкі падчас правядзення тэматычных вечароў у палацы Радзівілаў.



**• Наша даведка**

Фабрыка Rönisch была заснавана ў 1845 годзе ў Дрэздэне (Германія) Карлам Рэнішам. Ён памёр у 1894-м ва ўзросце 80 гадоў. Кіраванне кампаніяй перайшло ў рукі яго сыноў: Альберту — у якасці бізнес-менеджара і Герману — у якасці менеджара вытворчасці. У 1897 годзе сыны Рэніша адкрылі фабрыку ў Санкт-Пецярбургу(а закрылася яна ў 1917 годзе). У 1900-м на Сусветнай Парыжскай выстаўцы Rönisch атрымлівае залаты медаль. Іншыя ўзнагароды атрыманы на выстаўках у Амстэрдаме, Сіднэі, Чыкага, Мельбурне...

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Прыём заявак на XIX Рэспубліканскі турыстычны конкурс

## «Пазнай Беларусь»



**Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнае агенцтва па турызме абвяшчаюць старт XIX Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» 2021 года.**

Сярод задач конкурсу — стымуляванне канкурэнтаздольнасці рынку турыстычных паслуг Рэспублікі Беларусь, узнагароду за ўнёсак у развіццё турыстычнай індустрыі, прыцягненне ўвагі да турыстычных брэндаў, стварэнне станоўчага вобраза Рэспублікі Беларусь як краіны, прывабнай для турыстаў, экскурсантаў, прыцягненне насельніцтва да актыўных формаў адпачынку, прапаганда здаровага спосабу жыцця, папулярызацыя гістарычных славутасцяў, культурнай і прыроднай спадчыны Рэспублікі Беларусь, павышэнне прэстыжу прафесій, занятых у турыстычнай індустрыі, стымуляванне выкарыстання сучасных тэхналогій у турызме.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

• **«Я пазнаю Беларусь»**
Адказная асоба: Ганна Забаўская (+375 17 226 90 98)

• **«Экскурсавод года»**
Адказная асоба: Ганна Вашчынчук (+375 17 226 54 46)

• **«Турыстычная кампанія года»**
Адказная асоба: Тамара Меркулова (+375 17 203 71 99)

• **«Сродак размяшчэння года»**
паднамінацыі:
**«Аб'екты размяшчэння высокай цанавой катэгорыі і / або катэгорыі 4-5*»**
**«Аб'екты размяшчэння сярэдняй і нізкай цанавой катэгорыі і / або катэгорыі 3* уключна»**
**«Загарадны комплекс года»**

• **«Санаторый года»**
Адказная асоба: Юлія Кірпічонак (+375 17 327 08 02)

• **«Аграэкасядзіба года»**
паднамінацыі:
**«Агратурыстычны кластар»**
**«Этнакультура»**
**«Інавацыйны падыход»**
Адказная асоба: Алена Ліхімовіч (+375 17 327 08 02)

• **«Матэрыял года»**
паднамінацыі:
**«Інтэрнэт-СМІ»**
**«Друкаваныя СМІ (рэгіянальныя, рэспубліканскія)»**
**«Тэле- і радыё-СМІ (рэгіянальныя, рэспубліканскія)»**
**«Блог аб турызме»**
Адказная асоба: Кацярына Аляксеева (+375 25 787 41 91)

• **«Музей года»**
паднамінацыі:
**«Рэспубліканскія і абласныя (уключна з мінскімі гарадскімі) музеі»**
**«Раённыя (гарадскія) музеі»**
**«Прыватныя музейныя ініцыятывы»**
Адказная асоба: Кацярына Шамарова (+375 29 165 80 04)

• **«Праект экалагічнага турызму года»**
Адказная асоба: Наталля Раманенка (+375 29 120 06 51)

• **«Аб'ект прамысловага турызму года»**
Адказная асоба: Дар'я Шыбека (+375 17 226 54 46)

• **«Віртуальны праект года»** (мабільныя дадаткі, віртуальныя туры, сайты)
Адказная асоба: Кацярына Шамарова (+375 29 165 80 04)

• **«Мерапрыемства падзейнага турызму года»**
Адказная асоба: Кацярына Рудак (+375 17 226 01 47)

• **«Мой родны кут»**
паднамінацыі:
**«Літаратурны твор» (проза / паэзія)**
**«Жывапіс»**
**«Фатаграфія»**
Адказная асоба: Дзіна Гарэлік (+375 17 226 54 46)

Заяўкі прымаюцца да **5 лістапада**.

З Палажэннем аб конкурсе можна азнаёміцца па спасылцы https://www.belarustourism.by/bitrix/templates/.default/components/bitrix/news.list/main-inklyuzivnyy-turizm/ ПОЛОЖЕНИЕ о Конкурсе.

Кантактныя даныя па агульных пытаннях:
+375 (17) 327 08 02,
info@belarustourism.by

УНП 190276566

Радавод

# РОДАМ АД ДАНІЛЫ ІРЦІШЧАВА

## Што вядома пра беларускіх продкаў Дастаеўскага

**Што мы ведаем аб продках Фёдара Міхайлавіча? Ганна Рыгораўна Дастаеўская напісала ў 1897 годзе свяшчэнніку ў сяло Дастоева на Берасцейшчыне: «Мой нябожчык муж Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі шмат разоў гаварыў мне, што яго род паходзіць у (гістарычнай) Літве ад пінскага маршалка Дастаеўскага, абранага ў сейм у 1598 г. Пётр Дастаеўскі і яго нашчадкі жылі ў Дастоеве». Ганна Рыгораўна прасіла даслаць ёй звесткі аб продках Дастаеўскага, якія захаваліся ў царкоўных кнігах. Мы не ведаем, ці атрымала Ганна Рыгораўна якія-небудзь звесткі з Дастоева...**

Ужо ў наш час беларускі літаратуразнавец Сямён Букчын правёў архіўныя росшукі інфармацыі аб продках Дастаеўскага, у тым ліку ім былі дасследаваны Літоўская метрыка, пісцовая кніга Пінскага стараства, акты Віленскай археаграфічнай камісіі.

Першай з датаваных дакументаў была грамата, выдадзеная 6 кастрычніка 1506 года пінскім князем Фёдарам Іванавічам Яраславічам родапачальніку Дастаеўскіх Данілу Іванавічу Ірцішчаву на валоданне сялом Дастоевым паміж рэкамі Пінай і Ясельдай: «А дали есмо тому нашему боярину тое имене со всем с тым, што из старины к тем дворищом прислухало, с землями пашными и з бортными, и з их ловы, и з реками, и з луги, и з сеножатьми, и з езы, и з озёры и со всех тых земель входы. А волен тот боярин наш в том своём имении, в данине нашей двор собе поселити, и пашню вчинити, и млыны сыпати... А людям его подводы не давати, а ни в облаву не ходити, и ни повозу не визити. А дали есмо тое именье тому нашему боярину вечно и непорушно, ему и его жоне, и их детем, и их счадком».

Такім чынам, нашчадкі Данілы Ірцішчава з гэтага часу назаўсёды становяцца Дастаеўскімі. Яго сыну, Сямёну Данілавічу Дастаеўскаму, у сувязі з жаніцьбай «пацвярджальную грамату» выдае каралева Бона. Фёдара Іванавіча Дастаеўскага, «земяніна Пінскай харугвы», называе сваім «упаўнаважаным прыяцелем» Андрэй Курбскі, які збег з Масквы ў Літву.

Брат Фёдара, Стэфан, атрымлівае ад караля Стэфана Баторыя прывілей на мінскі Узнясенскі праваслаўны манастыр: «...и того монастыря со всим спокойне ужывати, аж до живота своего». Але валодаў Стэфан ім нядоўга: мітрапаліт кіеўскі Ільля і каштальян мінскі Ян Глябовіч паскардзіліся каралю, што Дастаеўскі, з'яўляючыся чалавекам свецкім і «да таго ж закону не грэчаскага», даходамі карыстаецца, а аб кіраванні манастыром не клапоціцца: «Только дей для пожитку своего тот монастыр держит, а фала божья никгды в нём водле закону греческого полнена не бывает».

Прадстаўнік чацвёртага пакалення роду Пётр Дастаеўскі — маршалак Пінскага павета і член Галоўнага трыбунала Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта яго згадвала ў пісьме Ганна Дастаеўская. «Па сваім становішчы, — піша гісторык Кірпоцін, — павятовыя маршалкі стаялі высока, іх далейшым павышэннем з'яўлялася сенатарскае крэсла, яны былі галоўнымі правадырамі дваранскага апалчэння свайго павета і іншы раз разбіралі справы, якія падлягалі дворнаму каралеўскаму суду».

Дарэчы, сесіі Галоўнага трыбунала праходзілі раз на год у самым старажытным і моцным замку Вялікага Княства Літоўскага — Навагрудскім.

Стэфан Дастаеўскі падпісваўся па-беларуску, Пётр — па-польску...

Пражываць і растрачваць маёмасць продкаў пачаў Бенедыкт Пятровіч Дастаеўскі. У другой палове XVII стагоддзя на Дастоеве ўжо была пазыка ў восем тысяч злотых. Маёнтак сына Бенедыкта Рамана — Востраў — быў разрабаваны. Дарэчы, у Пушкінскім доме Акадэміі навук Расіі захоўваецца старажытнае Евангелле, якое яму належала.

З XVII стагоддзя сярод продкаў Фёдара Дастаеўскага адзначаюцца асобы духоўнага звання, найбольш вядомы з іх іераманах Кіева-Пячэрскай лаўры Акіндзій Дастаеўскі. Трэба сказаць, менавіта ў XVII стагоддзі выявілася моцнае ўнутранае супраціўленне рэлігійнай Брэсцкай уніі 1596 года, па якой ушчамляліся правы праваслаўнага насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага. Многія нашчадкі беларускай і ўкраінскай шляхты ішлі ў служыцелі праваслаўя.

У XVIII стагоддзі продкі Фёдара Дастаеўскага жылі пераважна на Украіне, прадзед пісьменніка быў свяшчэннікам у Брацлаве на Падоллі. Можна сказаць, што Дастаеўскія ў XVII — XVIII стагоддзях прайшлі той жа шлях, што і пераважная большасць засцянковай шляхты ВКЛ — здрабненне, страта маёнткаў, правоў і багацця. Заставалася толькі памяць аб былой велічы, аб гордых продках, якія адным голасам маглі заблакіраваць любое рашэнне сейма.

**Алесь КАЖАДУБ.**

# ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «МАГИЯ OLA!»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Магия Ola!» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Ola», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Магия Ola!» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2015 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192452588 (далее – Организатор). Юридический адрес Организатора: 220030, г. Минск, ул. Ленина, д.50, 5-й этаж, пом. 1.

**2. Заинтересованное лицо**

Заинтересованным лицом Рекламной игры (далее – Заинтересованное лицо) является:

акционерное общество «ХАЙДЖЕНИК», зарегистрированное в Едином государственном реестре юридических лиц на территории Российской Федерации за 1025000653281 от 21.10.1998 г. Юридический адрес: 142701, Московская область, г. Видное, Белокаменное шоссе, д. 18.

**3. Участники Рекламной игры «Магия Ola!»**

Участниками Рекламной игры могут быть достигшие возраста 14 лет физические лица, граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь, которые выполнили условия п. 10 настоящих Правил (далее – Участник).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором и (или) заинтересованным лицом, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Название Рекламной игры: «Магия Ola!»**

**5. Территория проведения Рекламной игры: Республики Беларусь.**

**6. Дата начала Рекламной игры: 27 октября 2021 г.**

**7. Дата окончания Рекламной игры: 15 января 2022 г.**

**8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра (Игровой продукт):**

Таблица № 1. Игровые продукты Рекламной игры

| № | Наименование Игрового продукта |
|---|---|
| | Ежедневные прокладки |
| 1 | Прокладки женские гигиенические впитывающие на каждый день OLA! DAILY уп. 20 |
| 2 | Прокладки женские гигиенические впитывающие на каждый день OLA! DAILY уп. 40 |
| 3 | Прокладки женские гигиенические впитывающие на каждый день OLA! DAILY уп. 60 |
| 4 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Бархатная роза» уп. 20 |
| 5 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Бархатная роза» уп. 60 |
| 6 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Зеленый чай» уп. 20 |
| 7 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Зеленый чай» уп. 60 |
| 8 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Золотистая лилия» уп. 20 |
| 9 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Золотистая лилия» уп. 60 |
| 10 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Лепестки акации» уп. 20 |
| 11 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Лепестки акации» уп. 40 |
| 12 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Лепестки акации» уп. 60 |
| 13 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Ромашка» уп. 20 |
| 14 | OLA! SILK SENSE DAILY Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Ромашка» уп. 60 |
| 15 | OLA! LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные стринг-мультиформ, уп. 20 |
| 16 | OLA! LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные стринг-мультиформ уп. 60 |
| 17 | OLA! SILK SENSE LIGHT прокладки тонкие женские ежедневные, стринг-мультиформ ароматизированные, «Нежная лилия» уп. 20 |
| 18 | OLA! SILK SENSE LIGHT прокладки тонкие женские ежедневные, стринг-мультиформ ароматизированные, «Нежная лилия» уп. 60 |
| 19 | OLA! SILK SENSE LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные, стринг-мультиформ ароматизированные, «Белый пион» уп. 20 |
| 20 | OLA! SILK SENSE LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные, стринг-мультиформ ароматизированные, «Белый пион» уп. 60 |
| 21 | OLA! SILK SENSE LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные стринг-мультиформ ароматизированные, «Нежная лилия» уп. 20 |
| 22 | OLA! SILK SENSE LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные стринг-мультиформ ароматизированные, «Ромашка» уп. 20 |
| 23 | OLA! SILK SENSE LIGHT Прокладки тонкие женские ежедневные стринг-мультиформ ароматизированные, «Ромашка» уп. 60 |
| 24 | OLA! DAILY LARGE Прокладки женские гигиенические впитывающие на каждый день уп. 20 |
| 25 | OLA! SILK SENSE DAILY LARGE Прокладки женские гигиенические впитывающие ароматизированные, на каждый день «Ромашка» уп. 20 |
| | Прокладки на критические дни |
| 26 | OLA! CLASSIC Прокладки женские гигиенические впитывающие уп. 10 |
| 27 | OLA! CLASSIC Прокладки женские гигиенические впитывающие уп. 20 |
| 28 | OLA! CLASSIC WINGS NORMAL Прокладки женские гигиенические впитывающие «Мягкая поверхность» уп. 10 |
| 29 | OLA! CLASSIC WINGS SUPER Прокладки женские гигиенические впитывающие «Мягкая поверхность» уп. 10 |
| 30 | OLA! CLASSIC WINGS NORMAL Прокладки женские гигиенические впитывающие «Сеточка» уп. 10 |
| 31 | OLA! CLASSIC WINGS SUPER Прокладки женские гигиенические впитывающие «Сеточка» уп. 10 |
| 32 | OLA! SILK SENSE CLASSIC Прокладки женские гигиенические впитывающие для нормальных выделений «Ромашка» уп. 10 |
| 33 | OLA! SILK SENSE CLASSIC Прокладки женские гигиенические впитывающие для обильных выделений «Ромашка» уп. 10 |
| 34 | OLA! CLASSIC WINGS NORMAL Прокладки женские гигиенические впитывающие для нормальных выделений в индивидуальной упаковке «Мягкая поверхность», уп. 10 |
| 35 | OLA! CLASSIC WINGS SUPER Прокладки женские гигиенические впитывающие для обильных выделений в индивидуальной упаковке «Мягкая поверхность», уп. 8 |
| 36 | OLA! CLASSIC WINGS NORMAL Прокладки женские гигиенические впитывающие для нормальных выделений с сеточкой в индивидуальной упаковке «Сеточка», уп. 10 |
| 37 | OLA! CLASSIC WINGS SUPER Прокладки женские гигиенические впитывающие для обильных выделений с сеточкой в индивидуальной упаковке «Сеточка», уп. 8 |
| 38 | OLA! SILK SENSE CLASSIC WINGS NORMAL Прокладки женские гигиенические впитывающие для нормальных выделений «Ромашка» в индивидуальной упаковке, уп.10 |
| 39 | OLA! SILK SENSE CLASSIC WINGS SUPER Прокладки женские гигиенические впитывающие для обильных выделений «Ромашка» в индивидуальной упаковке, уп. 8 |
| 40 | OLA! SILK SENSE CLASSIC WINGS Night Прокладки женские гигиенические впитывающие ночные «Ромашка» в индивидуальной упаковке, уп. 7 |
| 41 | OLA! Ultra LUXE NORMAL Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для нормальных выделений LUXE «Ионы серебра» уп. 10 шт. |
| 42 | OLA! Ultra LUXE SUPER Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для обильных выделений «Ионы серебра» уп. 8 шт. |
| 43 | OLA! Ultra LUXE NORMAL Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для нормальных выделений «Мягкий шелк» уп. 10 шт. |
| 44 | OLA! Ultra Night Прокладки женские гигиенические ультратонкие, ночные «С бархатистой сеточкой с ионами серебра» уп. 7 |
| 45 | OLA! Ultra NORMAL Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для нормальных выделений «С бархатистой сеточкой», уп. 10 шт. |
| 46 | OLA! Ultra SUPER Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для обильных выделений «С бархатистой сеточкой», уп. 8 шт. |
| 47 | OLA! SILK SENSE Ultra Night Прокладки женские гигиенические ультратонкие, ночные ароматизированные «Ромашка» уп. 7 |
| 48 | OLA! SILK SENSE Ultra NORMAL Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для нормальных выделений ароматизированные «Ромашка» уп.10 |
| 49 | OLA! SILK SENSE Прокладки женские гигиенические ультратонкие для обильных выделений ароматизированные «Ромашка» уп. 8 |
| 50 | OLA! Ultra Night Прокладки женские гигиенические ультратонкие, ночные с шелковистой поверхностью «С ионами серебра» |
| 51 | OLA! Ultra NORMAL Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для нормальных выделений «С шелковистой поверхностью», уп. 10 шт. |
| 52 | OLA! Ultra SUPER Прокладки женские гигиенические ультратонкие, для обильных выделений «С шелковистой поверхностью», уп. 8 шт. |
| | Тампоны |
| 53 | Тампоны женские гигиенические OLA! NORMAL «Шелковистая поверхность», уп. 16 |
| 54 | Тампоны женские гигиенические OLA! NORMAL «Шелковистая поверхность», уп. 8 |
| 55 | Тампоны женские гигиенические OLA! NORMAL «Шелковистая поверхность», уп. 8 |
| 56 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER PLUS «Шелковистая поверхность», уп. 16 |
| 57 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER PLUS «Шелковистая поверхность», уп. 8 |
| 58 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER «Шелковистая поверхность», уп. 16 |
| 59 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER «Шелковистая поверхность», уп. 16 |
| 60 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER «Шелковистая поверхность», уп. 8 |
| 61 | Тампоны женские гигиенические OLA! SUPER «Шелковистая поверхность», уп. 8 |
| | Бумажная продукция |
| 62 | OLA! SILK SENSE Платочки носовые бумажные, ароматизированные «Ромашка» уп. 10 |
| 63 | OLA! SILK SENSE Платочки носовые бумажные уп. 10 |
| 64 | OLA! SILK SENSE Платочки носовые бумажные уп. 10 |
| 65 | OLA! SILK SENSE Бумажные полотенца уп. 2 |
| | Ватные диски и палочки |
| 66 | Ola! Silk Sense Ватные диски уп. 100 |
| 67 | Ola! Silk Sense Ватные диски уп. 120 |
| 68 | Ola! Silk Sense Ватные диски уп. 50 |
| 69 | Ola! Silk Sense Ватные диски уп. 80 |
| 70 | OLA! SILK SENSE Ватные палочки уп. 100 (в круглой банке) |
| 71 | OLA! SILK SENSE Ватные палочки уп. 200 (в круглой банке) |
| 72 | OLA! SILK SENSE Ватные палочки уп. 300 (в прямоугольной банке) |
| 73 | OLA! SILK SENSE Ватные палочки уп. 100 (в полиэтиленовой упаковке) |
| 74 | OLA! SILK SENSE Ватные палочки уп. 200 (в полиэтиленовой упаковке) |

**9. Состав и размер призового фонда Рекламной игры «Магия Ola!»**

Призовой фонд составляет: **5 840,57 (пять тысяч восемьсот сорок) белорусских рублей пятьдесят семь копеек.**

Призовой фонд сформирован за счет денежных средств Заинтересованного лица.

Таблица № 2. Призовой фонд Рекламной игры

